ЦАНА НУМАРУ—5 КАП.

УМОВЫ ПАДПІСКІ (з дармовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес. . . — 90 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к., іншагародніх абвестак—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы даражэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Звыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. -вдатку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „ЗЬВЯЗДА“ Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар 10-74
Сакратар 6-19
Партсэктар . . . 13-80
Сэктар інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
» абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ, 11 мая 1930 г.
№ 108 (3706)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

Правакатары вайны за працай

Учора ў нашай газэце мы адзначылі факт абураючага правакацыйнага выпаду віленскай газэты «Кур'ер Віленскі» супроць Савецкага Саюзу, супроць нашай савецкай ноты да польскага ўраду ў сувязі з няўдалым замахам на савецкае паўпрэдзтва ў Варшаве. Мы адзначалі таксама, што выступленьне «Кур'ера Віленскага» не зьяўляецца адзіننым, а што пэўная частка польскага друку вядзе стапую правакацыйную кампанію супроць Савецкага Саюзу, карыстоўваючы нават для гэтай кампаніі апошні замах на савецкае паўпрэдзтва ў Польшчы. ГЭТА АНТЫСАВЕЦКАЯ КАМПАНІЯ ЗНОЎ ЗНАЧНА ЎМОЦНІЛАСЯ Ў АПОШНІЯ ДНІ.

Кампанія вядзецца цяпер вакол сьледзтва, якое павінна было-б выкрыць сапраўдных арганізатараў і інсьпіратараў замаху на наша паўпрэдзтва. Калі ў пачатку сьледзтва афіцыйныя заявы дастаўнікоў ураду і паасобных польскіх газэт падкрэсьлівалі вялікія разьвалы выкрытай пякельнай машыны, якая магла-б пры выбуху разбурыць не толькі дом паўпрэдзтва, але і суседнія дамы, то зараз частка польскай прэсы, па камандзе падняла кампанію, якая на мяце змазаць разьмеры і значэньне няўдалага замаху.

Асобныя газэты, ўзмоцнена мусіруючы чуткі, што быццам выкрытая бомба не змагла-б прынесьці ніякай вялікай шкоды, што яна была так зроблена, што не змагла-б і выбухнуць.

Чарашнія паведамленьні савецкіх карэспандэнтаў з Варшавы падкрэсьлівалі, што сыгнал для антысавецкай кампаніі ДАДЗЕНЫ ПА ЎСЁЙ ЛІНІІ. Варшаўская газэта «АБЦ» якая як відаць, мае інфармацыі ад сьледчых органаў, абапіраецца, што «канец сьледзтва прынесе сэнсацыйныя падрабязнасьці». Гэта газэта гаворыць аб нейкіх дзіўных дарожках начальніка палітычнай паліцыі ў Беластоку, дзе быццам «да сьледзтва прыцягнуты мясцовыя камуністы». Ня трудна дагадацца, што за гэтымі паведамленьнямі варшаўскай прэсы хаваюцца падрыхтаваньні да кампаніі НОВАЙ ПРАВАКАЦЫІ ў сувязі з ходам усяго сьледзтва. Калі мы возьмем пад увагу, што наглыя выпады «Кур'ера Віленскага» аб тым, што варшаўская бомба была «выгаднай крамай ураду», падхопліваюцца афіцыёзам «Газэтай Польскай», якая гаворыць аб тым, што «замах на савецкае паўпрэдзтва на руку савецкай замежнай прапагандзе», то ясна будзе, што новай хваляй антысавецкай кампаніі СТАЯЦЬ ЎПЛЫВОВЫЯ КОЛЫ ВЫСТАЎСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Як бачым, як робіцца правакацыйная спроба сарваць сьледзтва, падсунуць правакацыйныя вынікі гэтага сьледзтва, якія можна было-б выкарыстаць для новай хлусьні па адрасу Савецкага Саюзу. Зразумела, што ПА ГЭТАЙ САМАЙ ЛІНІІ ідуць інтэрвью Пілсудскага паспа ў Латвіі Арцішэўскага, пасля чым мы пісалі ўчора ў газэце, інтэрвью польскага паспа ў Лёндане, які таксама робіць спробы змазаць палітычнае значэньне няўдалага замаху на савецкае паўпрэдзтва.

Усім гэтым панцугу выступленьняў і дадаць выразна імкненьне польскіх правых колаў зьвесьці на-нет усё сьледзтва ў справе замаху і такім чынам практычна ЎКРЫЦЬ ВІНАВАТЫХ у гэтым замаху. Няма патрэбнасьці даводзіць, што падобныя спробы польскага друку і тых сіл, якія стаяць за ім, спрычыняцца рашучы адпор з боку ўсёй савецкай грамадзкасьці. Толькі шапёная бесстарная антысавецкая кампанія, вядзецца фашыстаўскім і сацыялістаўскім друкам пры падтрыманьні іншых кіруючых сфэр ствараюць у Польшчы атмасфэру сталай пагрозы савецкім прадстаўнікам, а разам з гэтым пагрозу міру, пагрозу нармальным адносінам - савецкім адносінам. Гэтая кампанія падрыхтоўвае ваенныя авантуры супроць Савецкага Саюзу. Вядомыя выкулы Дмоўскага яшчэ раз паказваюць з якой актыўнасьцю вядзецца паміж народнымі і польскімі імпэрыялістамі падрыхтоўка вайны супроць Савецкага Саюзу.

Пасьля замаху на савецкае паўпрэдзтва, мы мелі з боку прадстаўнікоў польскага ўраду цэлы рад заяў і запэўненьняў у мірным характары іх палітычных адносінах да Савецкага Саюзу. Цяпер, і на гэты раз, запэўненьні польскага ўраду аказаліся толькі чарговай афіцыйнай балбатнёй, якая мае на мэце прыкрываць падрыхтоўку да новых ваенных авантур, што актыўна вядзецца польскімі імпэрыялістамі.

Зусім невыпадкова адна з апошніх нумароў «Газэты Польскай» у вельмі рэзкім тоне піша аб гадавіне «кіеўскага паходу». Афіцыёзны орган расцэньвае, каб яшчэ і яшчэ раз усхваліць польскага імпэрыялізму аб «шляхецкай Польшчы «ад Балтыцкага да Чорнага мора». «Известия» вельмі рэзка на прыпомніці польскім імпэрыялістам ў адказ на гэты артыкул, што «ДАСЯ МАЯ БЫЎ ЧЭРВЕНЬ. Мы-б сказалі гэроям кіеўскай авантуры не за гэтых падрабязнасьцяй гістарычнага календара незабываць таго, што польскія перамогі польскіх імпэрыялістаў скончыліся чэрвеньскім парамі і разгромам.

САВЕЦКІ ЎРАД ЦЬВЁРДА І НЯХІТРА НА ВЯДЗЕ ПАЛІТЫКУ МІРУ, палітыку ўстанаўленьня нармальных адносін з дзяржавамі Захаду. Гэта мірная палітыка знайшла таксама сваё адзіننае ў ноце савецкага ўраду з нагоды замаху на савецкае паўпрэдзтва ў Варшаве. Савецкая грамадзкасьць цалкам трымлівае гэту мірную палітыку ўраду - сялянская савецкага ўраду, калі правакатары ваенных авантур, якія актыўна працуюць у фашыстскай Польшчы думаюць, што гэтая мірная палітыка зьяўляецца паказам нашай слабасьці, то яны памыляюцца. Працоўныя масы Савецкага Саюзу патрабуюць, каб палітыка ў справе варшаўскага замаху была даведзена да канца і каб былі выкрыты сапраўдныя вінаватыя гэтага замаху. У адказ-жа на правакацыйную кампанію зноў паднятую польскай фашыстскай прэсай працоўныя Савецкага Саюзу умоцняць сваю гатоўнасьць адпор усякім імпэрыялістам авантурам.

Сяўбе сілосных культур аддаецца мала ўвагі

ПЛЯН ПА КУКУРУЗЕ І СЛАНЭЧНІКУ ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 0,9 ПРОЦ.

Папулярызаваць ільготы за засеў сілосных культур

Засеяна толькі 50 гэкт. сілосных культур

З сяўбой сілосных культур (кукурузы і слоначніку) у БССР справа абстаіць катастрафічна. Мясцовыя зямельныя арганізацыі проста ігнаруюць гэтыя культуры і ўпарта ня выконваюць пляновых заданьняў, вызначаных Наркамзэмам БССР.

Паводле пляну ў БССР павінна быць засеяна пад сілосныя культуры 5.800 гэкт. Між тым, на сёнешні дзень па ўсёй рэспубліцы, засеяна слоначнікаў 15 гэкт. і кукурузы 35 гэкт. Гэта складае... 0,9 проц. пляну.

Гомельскі акрэг адловіўся ад выканаьня пляну пасеву кукурузы, матывуючы гэта тым, што апошняя прыслана неабмалочанай і што на месцы няма спэцыяльных малатарань.

Такое тлумачэньне ня вытрымлівае ніякай крытыкі, бо калгасам трэба пасеяць прыблізна па адной пятай тоне кукурузы, а такую колькасьць можна абмалаціць сваімі сіламі за гадзіну.

У Бабруйскай, Полацкай, Магілеўскай і Менскай акругах як калгасамі, так і індывідуальнымі гаспадаркамі пад сілосныя культуры яшчэ не засеян ніводзін гэктар. Саўгасамі БССР засеяна ўсяго 12 гэкт. слоначнікаў і 11 гэкт. кукурузы. У Мазырскай акрузе калгасамі засеяна: слоначнікамі 3 гэкт. і кукурузай — 15 гэкт.

Наркамзему БССР трэба прыняць тэрміновыя рашучыя меры для забесьпячэньня поўнага выкананьня пляну засеву сілосных культур у БССР. Тыя ўстановы і асобныя працаўнікі, якія злосна ігнаруюць засеў кукурузы і слоначнікаў, павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

З завозам насеньня сілосных культур справа стаіць так. Вызначаныя для БССР 400 тон насеньня кукурузы ўжо цалкам завезены. З вызначаных 40 тон насеньня слоначнікаў, пакуль што завезена толькі 33 тоны. Гэтай колькасьці, бязумоўна, ня хопіць для поўнага выкананьня пляну засеву сілосных культур. Для сіласаваньня павінны быць шырока выкарыстаны ўсе віды зялёнай масы, як бацьвіньне, атава і г. д.

Пачынаньне менскага АК ЛКСМБ

У сувязі з адозвай наркома земляробства БССР тав. РАЧЫЦКАГА да камсамольскай арганізацыі аб удзеле камсамолу ў пабудове 22.000 сілосных ям і траншэй, менскі акругком ЛКСМБ зьвярнуўся з спэцыяльным пістом да ўсіх раўкомаў ЛКСМБ Менскай акругі.

Мен. АК КП(б)Б прапануе ўсім райкомам шырока папулярызаваць ідэі сіласаваньня сярод камсамольцаў. Кожная камсамольская ячэйка павінна ўзяць на сябе абавязак пабудаваць ня менш 5 узорных сілосных ям. Ячэйка павінна мабілізаваць вакол гэтай работы батрацка - бядняцкую і серадняцкую моладзь з тым, каб дабіцца пабудовы на тэрыторыі дзейнасьці ячэйкі ня менш 35 ям і траншэй.

Адказнасьць за пабудову сілосных ям і траншэй у раёнах нясуць раённыя камітэты ЛКСМБ, якія павінны зьявіцца штурхачамі да хутчэйшага выкананьня гэтай работы. Райкомы павінны кожныя 10 дзён інфармаваць Мен. АК КП(б)Б аб ходзе работы.

Райкомы ЛКСМБ павінны ў бліжэйшы час склікаць раённыя нарады старшынь калгасаў і кіраўнікоў саўгасаў па пытаньні аб правядзеньні сіласаваньня ў раёне, даючы рашучы адпор усялякім намерам затрымліваць гэту важную справу.

Мен. АК ЛКСМБ выказвае надзею, што Менская камсамольская арганізацыя праявіць максімум энэргіі і энтузіязму ў справе вырашэньня праблемы жывёлагадоўлі.

Важнейшыя дырэктывы пад сукном

ПОЛАЦАК. (Наш кар.). Ня гледзячы на тэлеграфны загад Наркамзему БССР аб зьмяншэньні цэн на сельска - гаспадарчыя машыны, полацкі акрпаляводсаюз прамарынаваў яго 12 дзён у сабе, не даводзячы гэту важную дырэктыву да месц.

Такія адносіны акрпаляводсаюзу да пасеўнай кампаніі перашкаджаюць свайчасовому забесьпячэньню калгасных і індывідуальных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак сельска - гаспадарчымі машынамі.

Лепельскі райкалгассаюз яшчэ да гэтага часу не атрымаў ад акрпаляводсаюзу лімітных цэн на авёс, што затрымлівае абмен звычайнага аўсу на гатунковае насеньне.

Камісія, якая зараз праводзіць чыстку апарату акркалгассаюзу, павінна выявіць вінаватых у гэтых зьявішчах.

СВОЙ.

Арганізацыйныя непарадкі затрымліваюць *разгортваньне сяўбы*

Весткі аб ходзе сяўбы па Жлобінскім раёне (Бабруйшчына) паказваюць, што тэмп сяўбы яшчэ вельмі далёкі ад баявога існуючыя ў раёне 46 калгасаў (яны займаюць 19 проц. агульнай плошчы раёну і яднаюць 15 проц. усіх гаспадарак раёну) на 5 мая засеялі 1.769 гэкт., што складае 24 проц. выкананьня пляну веснавой сяўбы. Па індывідуальным сэктары засеяна 33 проц. яравога кліну.

Адной з грунтоўных прычын марудлівага тэмпу сяўбы ў калгасах зьяўляецца адсутнасьць належнай арганізацыі работы. У большасьці калгасаў няма нават такіх прымітыўных форм арганізацыі работы, як разьбіўка калгаснікаў на брыгады, выдача нарадаў на працу з вечару, а не раніцою, як гэта робіцца зараз. У выніку гэтага працоўная дысцыпліна і прадукцыйнасьць працы ў калгасах стаяць на нізкай ступені. Ва многіх калгасах яшчэ дагэтуль няма рабочых плянаў. Раённыя арганізацыі зусім не зварачаюць увагі на гэту важнейшую справу.

Значным тормазам сяўбы зьяўляецца і тое, што ў калгасах раёну не хапае кармоў—320 тон сена і 70 тон кармавога аўсу. Некаторыя калгасы, з прычыны недахвату кармоў, замест выездаў у поле, вымушаны разьяжджаць па вёсках і шукаць сена. Райкалгассаюз мае загатоўчы апарат, але нічога ня робіць, каб забясьпечыць калгасы кармамі. Між тым, недахват кармоў ужо адбіўся на паніжэньні ўдойнасьці кароў.

Абмен звычайнага насеньня на гатунковае праводзіцца слаба, асабліва ў індывідуальным сэктары. На сёпошні дзень у раёне ёсьць неабменена гатункового аўсу 4.000 пудоў. Дрэнна таксама абстаіць справа з крэдытаваньнем індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на набыцьцё насеньня і коняй. З вызначаных для гэтай мэты 67.000 руб., скарыстана толькі каля 1.000 руб. Па лініі калгасаў плян крэдытаваньня выканан на 60 проц. Усяго застацца нескарыстанымі на мерапрыемствы па веснавой пасеўнай кампаніі каля 170.000 руб.

Зусім не папулярызуюцца сярод індывідуальных гаспадарак і калгаснікаў тыя ільготы, якія даюцца за пасеў кукурузы і канапель. Характэрна, што райкалгассаюз ніяк ня можа разьмеркаваць 1 вагону кукурузы і нават хоча адправіць яго назад, кажучы, што ніхто кукурузы не бярэ. Гэта здарылася толькі таму, што не паклапаціліся правесьці належнага растлумачэньня.

Брыгадзір «Зьвязды» Апякін.

Бязьдзейнасьць--на руку кулаку

ДРЫСА, Полацкай акр.

Зводка аб ходзе раньняй сяўбы па раёне паказвае значнае адставаньне індывідуальнага сэктару. Так, калгасамі на 1 мая было засеяна 276 гэкт. аўсу, а індывідуальнымі гаспадаркамі — толькі 152 гэктары, канюшны засеяна калгасамі 575 гэкт., а індывідуальным сэктарам — 125 гэкт. І гэта ў той час, калі калгасы складаюць толькі 25 проц. агульнай плошчы.

Чым можна тлумачыць гэта? Праўда, пры вызначэньні яравога кліну былі дапушчаны скрыўленьні, але яны ў асноўным выпраўлены.

Тлумачэньня трэба шукаць перш за ўсё у адсутнасьці сыстэматычнай і належнай працы сярод індывідуальных бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Гэта адносіцца як да раённых, так і да сельскіх, савецкіх і партыйных арганізацый.

Мясцовыя работнікі прабуюць ўсё тлумачыць халодным надвор'ем і кажуць: «Калі стане цёплае надвор'е, дык сяўба адразу рушыцца наперад». Але не ў надвор'і толькі тут справа. Узяць хаця-б такую культуру, як канюшыну. Па індывідуальным сэктары, паводле пляну, неабходна засеяць канюшыну на плошчы звыш 1.200 гэктараў, а пакуль што засеяна толькі 125 гэктараў. Тут бязумоўна ўжо вызначылася пагроза недасеву канюшыны.

Пляну пасеву па паселішчах няма, няма і плянаў па папырэньні яравога кліну нават ў разрэзе сельсаветаў. На запытаньне аб гэтым даводзіцца чуць: «Павінен быць, ды ня ведаю, дзе ён дзеўся».

У РВК ня ведаюць, колькі кулацкіх і бросавых зямель застаецца нескарыстанымі на лініі калгасаў. Сялянскія т-вы ўзаемадапамогі справай грамадзкай апрацоўцы зямлі і складаньня дружным не займаюцца. Райком КСУ плян падрыхтоўкі да пасеўнай кампаніі выканаў толькі на якія-небудзь 40 проц. Фактычна нічога ня робіцца для дапамогі бядняцкім гаспадаркам у засеве іх палёў.

На складах райкалгассаюзу застаецца нескарыстаным каля 50 проц. загатоўленага і завезенага насеньня. Каму і як выдаваць насеньне, колькі яшчэ патрэбна для раёну і колькі адправіць для іншых раёнаў — усе гэтыя пытаньні стаяць перад райкалгассаюзам, але ён ня можа даць на іх дакладнага адказу.

Пры такім становішчы натуральна паўстае пагроза невыкананьня пляну веснавой сяўбы ў раёне. Няма ніякай магчымасьці наладзіць плянавае кіраваньне сяўбой на індывідуальным сэктары пры недавядзеньні плянаў ня толькі да асобнага двара, але нават да паселішча, пры адсутнасьці сыстэматычнай работы сярод беднаты і калгаснікаў. Такія дзеяньні, вярней такая бязьдзейнасьць, на руку кулаку.

Брыгадзір «Зьвязды» КЛІМАЎ.

Бальшавіцкае прывітаньне Кастрычніцкай раённай партканфэрэнцыі, якая сёньня адкрываецца

Да Кастрычніцкай райпартканфэрэнцыі

Кастрычніцкая арганізацыя прыходзіць да сваёй 3-й райпартканфэрэнцыі, XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) па-бальшавіцку зьнітаванай, устойлівай, баяздольнай весьці бязьлітасную барацьбу за генэральную лінію партыі на два франты як з правым, найбольш небясьпечным ухілам, так і з «левымі» загібамі.

Кастрычніцкай арганізацыяй прароблена вялікая работа па выкананьні прамфінпляну, у выніку чаго мы маем рост валавой прадукцыі па асноўных прадпрыемствах, якія ёсьць у Кастрычніцкім раёне, павялічэньне ўкладаньняў у новае капітальнае будаўніцтва радам прадпрыемстваў, выкананьне прамфінпляну па асноўных паказальніках за 1-е паўгодзьдзе (зав. «Чырвоная Зорка», вагонныя майстэрні і гуты).

Але, побач з гэтым, мы маем па цэлым радзе нашых прадпрыемстваў недавыкананьне прамфінпляну («Бальшавік», шчотачная фабрыка, «Энэргія»), а па некаторых нават і прарывы (шчаціная фабрыка, у якасных адносінах завод «Бальшавік»).

Ці ўсё зроблена для забесьпячэньня выкананьня прамфінпляну? Бязумоўна, не. Райком партыі ня мог папярэдзіць некаторыя прарывы ў гапіне выкананьня прамфінпляну, ня было праяўлена дастатковага кіраўніцтва ў выкананьні гэтай важнейшай задачы, ня была дастаткова згуртавана ўвага шырокіх рабочых мас вакол выкананьня прамфінпляну, вакол сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Некаторыя прафсаюзы не павярнулі сваёй работы тварам да вытворчасьці.

Кастрычніцкая арганізацыя па-бальшавіцку змагалася за чыстату ленінскай генэральнай лініі партыі.

Кастрычніцкая арганізацыя, як і ўся КП(б)Б, пад кіраўніцтвам свайго ЦК, вяла няўхільную барацьбу з правым ухілам у тэорыі і на практыцы (Сампрамсаюз, БСІКА і інш.) і з «левымі» загібамі.

Пытаньні сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі патрабавалі ад Кастрычніцкай арганізацыі, як арганізацыі буйнога пралетарскага цэнтру, асаблівай увагі.

Перад нашай арганізацыяй стаялі задачы паслаць лепшых таварышоў у вёску, дапамагчы вясковым партарганізацыям у рабоце па калектывізацыі, у мабілізацыі мас на бязьлітасную барацьбу з кулаком, па ліквідацыі кулацтва, як класы, на глебе суцэльнай калектывізацыі. Мінусам у рабоце Кастрычніцкай арганізацыі зьявілася тое, што пасланыя таварышы недастаткова інструктаваліся, ім не давалася дастатковай дапамогі ў іх рабоце.

Гэта, бязумоўна, адбілася на іх працы, на тым, што некаторыя з мабілізаваных т. т. ня здолелі павесьці рашучай барацьбы з перагібамі і скрыўленьнямі партыйнай лініі ў напгасным будаўніцтве.

У часе чысткі радоў партыі, разгортваючы самакрытыку, Кастрычніцкая арганізацыя прарабіла вялікую работу па ачышчэньні яе ад варожых і чужых элемэнтаў, па згуртаваньні ўвагі партыйных і беспартыйных мас вакол асноўных задач партыі. Самакрытыка ў часе чысткі савецкага апарату дала магчымасьць выявіць і ачысьціць яго ад нягодных і варожых нам людзей.

Але-ж, разам з тым, рад прарываў у разгортваньні самакрытыкі, памылкі раённага камітэту партыі ў гэтай галіне гавораць аб тым, што раённай арганізацыяй прароблена невыстарчальная праца ў разгортваньні самакрытыкі. Далейшая задача арганізацыі заключаецца ў тым, каб завастрыць увагу мас на пытаньнях разгортваньня самакрытыкі.

Унутры - партыйная дэмакратыя, асабліва ў часе справаздачна - перавыбарчай кампаніі, была разгорнута недастаткова. Бюро РК КП(б)Б у пачатку кампаніі несваячасова рэагавала на парушэньні ўнутры - партыйнай дэмакратыі, не завастрала ўвагі вакол гэтага пытаньня. Памылкі выпраўлены ў апошні час — гэта дало магчымасьць РК КП(б)Б з усёй бальшавіцкай цьвёрдасьцю мабілізаваць партыйныя масы на зьнішчэньне памылак.

Кастрычніцкая арганізацыя прыходзіць да сваёй канфэрэнцыі са значным папаўненьнем сваіх радоў за кошт лепшых, старых рабочых. Арганізацыя вырасла за час ад 2-й да 3-й канфэрэнцыі на 946 т. т.

Сацыяльны склад арганізацыі павялічыўся з 41 проц. рабочых ад станка да 50,68 проц., у той час, як агульны лік складу рабочых у арганізацыі 74,5 проц. Наша задача — у далейшым весьці сыстэматычную работу па ўцягненьні лепшых рабочых у рады партыі, па выхаваньні новага папаўненьня.

Кастрычніцкая арганізацыя на сваёй 3-й канфэрэнцыі здолее на аснове самай шырокай бальшавіцкай самакрытыкі праверыць сваю работу, выявіць свае памылкі і па-бальшавіцку мабілізаваць масы на ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі.

ДЗІЧКОЎСКІ.

Міжнародныя правакатары рыхтуюць вайну



28-га красавіка быў выпадкова выкрыты замах на савецкае паўпрэдзтва ў Варшаве. Снарад, які быў выкрыты ў дымаходзе, мог зруйнаваць увесь будынак. На здымку: снарад.

Апэляцыйны працэс фабрыкантаў антысавецкіх фальшывак

ЦЕСНАЯ СУВЯЗЬ ПАМІЖ УСІМІ ФАБРЫКАНТАМІ ФАЛЬШЫВАК

БЭРЛІН, 10. На другім пасяджэньні працэсу Арлова зноў адбыліся рэзкія сутычкі паміж абаронцамі Арлова і Сумарокава. Абаронца Арлова Яфэ заявіў, што паведамленьне друку аб тым, што Арлоў зьяўляецца вінаватым у пакараньні сьмерцю трох нямецкіх ваенна-палонных, не адпавядае сапраўднасьці. Саюз ваенна-палонных ня высоўваў супроць Арлова такога абвінавачаньня і пракурору нічога аб гэтым ня было вядома. Яфэ адзначае, што вінаватых фабрыкантаў фальшывак трэба шукаць у групе Сумарокава і Зывэрта. Ён, дарэчы, абрушваецца і на савецкі друк за крытыку нямецкай юстыцыі. Такімі мэтадамі Яфэ, відавочна, стараецца «настроіць» суд супроць СССР.

Абаронца Сумарокава Менц заяўляе, што «Ротэ Фанэ» зусім мае рацыю, калі лічыць, што ў даным выпадку гутарка ідзе аб новых фальшыўках Арлова, г. зн. аб бляшках саюзу ваенна-палонных. Арлоў падрабляў шматлікую колькасьць дакумантаў—ён трымаў сапраўдную майстэрню фальшывак. У довад сваіх слоў Менц перадаў суду рад дакумантаў з уласнымі заўвагамі Арлова.

Абаронца Арлова паміж іншым заявіў, што Арлоў ня супярэчыць супроць факту падробкі заўваг па дакумантах. Пракурор паказаў, што Арлоў прызнаецца ў падробцы заўваг для таго, каб надаць сваім «копіям копій» выгляд арыгінальных дакумантаў. З прычыны гэтага пракурор выказваецца супроць прапаноў абаронцы Сумарокава.

Пасьля выступленьня пракурора суд пераходзіць да чытаньня пратаколаў папярэдняга сьледзтва і першага працэсу. Пратаколы выяўляюць наяўнасьць цеснай сувязі паміж усімі бепагвардзейскімі фабрыкантамі фальшывак, асабліва паміж Арловым і Сумарокавым, які доўгі час быў у банку Арлова ў замку Сандау і ня раз атрымліваў ад яго грошы.

Адкрылася партканфэрэнцыя БВА

Учора ў клюбе Карла Маркса адкрылася IX партыйная канфэрэнцыя Беларускай вайсковай акругі.

На канфэрэнцыю прыбыў намесьнік старшыні Рэвваенсавету рэспублікі і наркамваенмора т. Уншліхт, якога на вакзале сустрэла ганаровая варта часьцей Менскага гарнізону. Тав. Уншліхт зробіць даклад аб рабоце Рэвваенсавету СССР і ПУР'у.

Канфэрэнцыю адкрыў член Рэвваенсавету БВА і нач. ПУОКР'у т Арэнштам. Першае слова было прысьвечана гэроям Далёка-Ўсходняй Чырвонасьцяжнай армії, тым, хто сваімі грудзьмі абараняў рэспубліку Саветаў, тым, хто крывёю заліў свае партыйныя і камсамольскія білеты. Памяць іх дэлегаты ўшанавалі ўставаньнем.

У прэзыдыум канфэрэнцыі абраны т. т. Уншліхт, Гей, Васілевіч, Ягораў, Арэнштам, Галаздзед, Вэнэк, Славінскі, сакратар Зах. абкому УсеКП(б) Румянцаў і інш.

У ганаровы прэзыдыум канфэрэнцыі абраны Палітбюро ЦК УсеКП(б), т. т. Арджанікідзе, Гамарнік, сакратар нямецкай кампартыі Тэльман, член Палітбюро ЦК кампартыі Польшчы т. Ленскі і т. Блюхер — камандуючы АДУЧА.

Канфэрэнцыя адразу-ж прыступіла да дзелавой работы, заслухаўшы даклад сакратара ЦК КП(б) т. Гея аб рабоце ЦК КП(б)Б.

У пачатку свайго слова т. Гей вітаў партыйную канфэрэнцыю БВА ад імя Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай Партыі бальшавікоў Беларусі.

Заля клюбу Карла Маркса ўпрыгожана шэфскімі сьцягамі часьцей Менскага гарнізону і лёзунгамі на беларускай і расійскай мовах, якія заклікаюць да рашучае барацьбы з антысеранніцкімі перагібамі, «левымі» скрыўленьнямі і правым ухілам, да ўзмацненьня абароназдольнасці краю, да рашучага павароту партыйных арганізацый часьцей акругі тварам да баявой падрыхтоўкі.

На канфэрэнцыю прыбыло 186 дэлегатаў з рашаючым голасам і 100 дэлегатаў з дарадчым.

Канфэрэнцыя пастанавіла паслаць прывітальныя тэлеграмы Цэнтральнаму Камітэту УсеКП(б), т. Сталіну, Рэвваенсавету СССР і ПУР'у, Цэнтральнаму Камітэту КП(б)Б, Заходняму абкому, цэнтральнаму армейскаму органу «Красной Звезде» і Асобнай Далёка-Ўсходняй Чырвонасьцяжнай Армії.

Крызіс у мэталёвай прамысловасьці Рурскай вобласьці

ВЭРЛІН, 9. Камуністычная «Рур Эхо» паведамляе: «Выраб прадукцыі ў мэталюргічнай прамысловасьці Рурскай вобласьці значна скарачаецца і за першыя тры месяцы 1930 году прадукцыя зьменшылася ў параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году на 368.000 тон; з 213.598 рабочых занятых у красавіку мінулага году ў жалезаапрацоўчай прамысловасьці, у лютым бягучага году ў ёй было занята 197.899 рабочых. У сакавіку і красавіку гэтага году былі праведзены шматлікія звальненьні рабочых. Тым ня менш міжнародны сталёвы картэль зноў уносіць прапанову аб неадкладным скарачэньні вытворчасьці на 10-15 проц., што пацягне за сабой новую хвалю масавых звальненьняў і закрыцьце прадпрыемстваў. Барацьба супроць новых плянаў сталёвых каралёў можа быць з посьпехам праведзена толькі самімі рабочымі на заводах пад кіраўніцтвам рэвалюцыйнай прафапазыцыі пад лёзунгамі: «За 7-гадзінны рабочы дзень, бяз зьніжэньня зарплаты», «За павышэньне зарплаты» і «барацьба супроць капіталістычнай рацыяналізацыі». (ТАСС).

Напружанае становішча ў Санкт-Пэльтэне

СУТЫЧКІ З ПАЛІЦЫЯЙ НЯ СПЫНЯЮЦЦА

ВЕНА, 8. Становішча ў прамысловым цэнтры ніжняй Аўстрыі Санкт-Пэльтэне, дзе ўжо тры дні адбываюцца бесспарадныя сутычкі паміж рабочымі, з аднаго боку, і паліцыяй, войскам і фашыстымі — з другога, увесь учарашні дзень заставалася напружаным. У горадзе ўведзены стан аблогі. Раней адкліканыя жандары зноў зьявіліся на шоўкавай фабрыцы, рабочыя якой ідуць на чале руху. Учора цэлы дзень працягваліся сутычкі рабочых з жандарамі. Праведзены новыя масавыя арышты. Фашысцкія рабочыя, якія працуюць на фабрыцы ў ночнай зьмене, маглі пакінуць прадпрыемства толькі пад аховаю жандараў. На працягу дня зьбіта і прагнана з фабрыкі многа фашыстых. (ТАСС).

***

ВЕНА, 8. У сувязі з пагрозаю рабочых зноў забаставаць, адклікана жандармэрыя з шоўкавай фабрыкі ў Санкт-Пэльтэне. Масавыя арышты працягваюцца. Арышты праводзяцца, галоўным чынам, па даносах хэймвэру. У рабочым раёне Санкт-Пэльтэне стан аблогі абвастрыўся да таго, што рабочым забараняецца нават стаяць каля сваіх дамоў. Арыштавана некалькі рабочых за папырэньне камуністычных адозваў. (ТАСС).

ПАРТЫЗАНСКІ РУХ НА ФІЛІПІНАХ

НЬЮ-ЁРК, 9. Як паведамляюць з Манілы (галоўны горад на Філіпінах), сяляне выспы Мінданас адмовіліся плаціць падаткі і арганізавалі партызанскія атрады. На выспу пасланы знатныя паліцэйскія сілы. Паміж партызанамі і паліцыяй адбыліся сутычкі. Забіта 4 і паранена 15 паліцэйскіх. Страты сялян невядомы.

Паведамляюць таксама, што сяляне, якія арандуюць зямлю ў правінцыях Лізон і Батаан адмовіліся ўносіць арэндныя плацяжы.

Капітуляцыя ўраду Маніу перад вайсковай эграяй

ВЕНА, 7. Паводле афіцыйнага паведамленьня з Бухарэсту, рада міністраў Румыніі прыняла адстаўку губарнатара Сяміградзьдзя — Парэскага і губарнатара Бэсарабіі Малдавану. Губарнатарам Сяміградзьдзя назначаны тав. міністра асьветы Валенін Малдаван, а губарнатарам Бэсарабіі—лідэр бэсарабскай фракцыі нац. царанистых (урадавая партыя) цяперашні міністар грамадзкіх работ—Халіта. Адстаўка губарнатараў — вынік нядаўняга крызісу ўраду Маніу. Крызіс узьнік у сувязі з сутычкай паміж урадам, з аднаго боку, і генэралітэтам і лібэраламі, з другога. Урад Маніу, жадаючы ўнікнуць новага ўрадавага крызісу, вымушаны быў капітуляваць перад лібэраламі і вайсковымі чынамі. (ТАСС).

Апэрацыйныя зводкі з гаспадарчага фронту

Бабруйскі камбінат на пераломе

ШТО ПАКАЗВАЕ КРАСАВІК

Лесасэх працаваў 174,8 рамазьмен —104 проц. рабочага часу, прадугледжанага плянам. Заданьне па расьпілоўцы сырцу выканана на 131,1 проц. Выпуск прадукцыі перавышае плянавае заданьне на 32,6 проц. Таксама перавышан процант выпуску экспартнай прадукцыі. Прадукцыйнасьць працы — на 10,7 проц. вышэй плянавага заданьня.

Фанэрны цэх таксама мае некаторыя посьпехі. Плян выпуску прадукцыі выканан поўнасьцю. Выдатканьне сырцу і процант выхаду гатовай прадукцыі адпавядаюць плянавым меркаваньням. Прадукцыйнасьць працы — вышэй плянавага заданьня.

Ня выкананы толькі плян у частцы выхаду экспартнага сырцу. Як і ў мінулыя месяцы, галоўным злом у рабоце камбінату — тэхнічныя прастоі, якія асабліва вырасьлі ў лесапільным цэху (15 проц.). У фанэрным цэху тэхнічныя прастоі ў красавіку складалі 5 проц.

Што датычыць лесапільных заводаў, якія аб'ядноўваюцца камбінатам, дык выкананьне імі праграмы малюецца наступным чынам:

лесазавод № 7 выканаў плян: па рамазьменах на 101,2 проц., па расьпілоўцы сырцу — на 107,8 проц., па прадукцыйнасьці працы — на 124,3 проц.;

лесазавод № 6: па рамазьменах — на 100 проц., па расьпілоўцы сырцу —на 107,8 проц., па прадукцыйнасьці працы — на 124,3 проц. і выпуску прадукцыі — на 104 проц.

А. МАГІДАЎ.

ЗАТРЫМКА ПА ВІНЕ „ЭНЭРГІІ“

Для пуску другога катла на электрастанцыі фабрык «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» і «ПРАЛЕТАРСКАЯ ПЕРАМОГА» не хапае двух каркасаў для паветранага эканамайзэра, зрабіць якія ўзяўся завод «ЭНЭРГІЯ».

Гэтымі днямі каркасы атрыманы электрастанцыяй. Але аказалася, што каркасы нельга скарыстаць, бо яны зроблены НЕ ПАВОДЛЕ ЧАРЦ

Супроць фашысцкай зямельнай палітыкі, за зямлю бяз выкупу

Прамова т. ЖАРСКАГА*)—камуністычнага дэпутата польскага сойму ў спрэчках па бюджэце міністэрства зямельных рэформ

Аграрная палітыка фашысцкага ўраду Пілсудзкага... (розныя выкрыкі) гэта палітыка ўзмацненьня буйнай памешчыцкай уласнасьці і павялічэньня кулацкага пласту на вёсцы. (Голас: Што гэта за новая кулацкая каста?) — Вы добра ведаеце. Кулакі — гэта багатыя сяляне, якія разам з памешчыкамі эксплёатуюць і прыпнятаюць шырокія масы беднякоў і серадняко ў.

Камасацыйная палітыка ўраду, гэта палітыка, якая ўнарадкуе гаспадаркі толькі тых сялян, якія маюць дастаткову колькасьць зямлі, каб пры аб'яднаньні дробных кавалкаў правесьці інтэнсыфікацыю выключна толькі багатых сялян, якія атрымліваюць крэдыты ад ураду. Для пераважнай большасьці вёскі, для беднаты, для малазямельных і большасьці серадняко ў фашысцкая камасацыя і мэліярацыя нясуць толькі новыя цяжары. (Крыкі і шум).

Вашы крыкі ня зьменяць таго факту, што супроць фашысцкай камасацыйна-мэліярацыйнай палітыкі паўстаюць вялізарныя сялянскія масы. Падзеі ў Слугучыцах, у Яворніку, у Лідзкім павеце і многіх мясцох Польшчы сьведчаць аб тым, што асноўныя сялянскія масы адчуваюць камасацыйна-мэліярацыйную палітыку ўраду, як палітыку памешчыцкую, кулацкую, палітыку, якая накіравана супроць шырокіх пластоў беднякоў і серадняко ў, тым больш, што пры камасацыі адбываецца шырока застасаваны выкуп зямлі беднаты праз кулакоў і адхіленьне гэтай беднаты ад зямлі. (Голас: Куды?) На жабрацтва, на павялічэньне армії беспрацоўных, на павялічэньне галечы на вёсцы. (Другі голас: А можа на іншыя надзелы?). Але, надзелы на могілках.

Гэта вынікі фашысцкай палітыкі і таму працоўныя сялянскія масы ў сваёй пераважнай большасьці паўстаюць супроць гэтай палітыкі. Масавыя актыўныя выступленьні на вёсцы паказваюць, што масы безьзямельных мала і сярэднязямельных усё больш разумеюць тыя лёзунгі, з якімі камуністыя ўжо шмат гадоў выступаюць на вёсцы і вычаць сялянскія масы, што толькі шляхам рэвалюцыйнай барацьбы яны вырвуць памешчыцкую зямлю, толькі шляхам рэвалюцыйнай барацьбы пад гегемоніяй пралетарыяту зямля будзе здабыта для сялян. (Надзвычайны шум).

Сялянскі рух супроць фашысцкай аграрнай палітыкі ідзе побач з вялізарным рухам супроць падатковых цяжараў, якія прыгнятаюць нячуваным спосабам сялян і рабочых супроць распродажу і падатковых экзэкуцый, супроць шарваркаў, супроць складак на «Стральца», на авіацыю — супроць гэтых цяжараў, якія ідуць на падрыхтоўку вайны з СССР, на ўтрыманьне фашысцкай дзяржавы, на турмы і на тэрор супроць гэтых самых мас.

Барацьба асноўных сялянскіх мас ва ўсёй Польшчы супроць падаткаў пашыраецца ўсё больш, а месцамі, асабліва ў раёнах голаду, яна прымае формы шырокага байкоту падаткаў — формы, якія мы паказваем масам, як адказ на фашысцкае прыгнечаньне. І сёньня гэты рэвалюцыйны рух на вёсцы сьведчыць найбольш выразна аб тым, што ня толькі лёзунгі, з якімі ідзе да сялянскіх мас «Беспартыйны Блёк» і ўрад, ня толькі яўна фашысцкія лёзунгі, але і ашуканчая дэмагогія ўсялякіх апартуністых, усё больш траціць у масах усякі ўплыў. Масы паварочваюцца супроць апартунізму, супроць угодніцтва, яны вучацца пазнаваць фарбаваных лісаў, пазнаюць тых, якія, як напрыклад, «Сялянская партыя», гавораць аб зямельнай рэформе бяз выкупу і вядуць палітыку згодніцтва да ўраду Пілсудзкага, палітыку здрады інтарэсам сялянскіх мас, яны вучацца пазнаваць тых, хто, як «ППС» і «Вызваленьне», узыходзяць на соймавую трыбуну і гавораць аб зьменах у зямельнай рэформе, дамагаючыся такім чынам пасьцяў у масах ілюзіі нібыта пры фашысцкім урадзе можна будзе атрымаць зямлю для сялянскіх мас. (Голас: Пане, ці ня ведаеш, як здароўе Куцепава?).

У сувязі з аграрным крызісам зараз гавораць аб тым, што нібыта высокія цэны навіны ўратаваць становішча мала і сярэдня-зямельных. Але гэтае ашуканства ўсё больш траціць паслухмянства ў масах. Само жыцьцё вучыць сялян, што аграрны крызіс гэта крызіс, зьвязаны і выкліканы праз агульны крызіс капіталізму, і будзе зьнішчаны толькі разам з капіталізмам. Аграрны крызіс ёсьць зараз не таму, што мала галодных, але наадварот, толькі таму, што іх надта многа, што галеча і жабрацтва расьце сярод працоўных пластоў з кожным днём. Узмацненьне галечы і жабрацтва на вёсцы ў Польшчы бярэ свой пачатак ня з часу нізкіх цэн на збожжа, але датуецца перш за ўсё ад пасьлямайскага пэрыяду. Іменна ў гэтым пэрыядзе палітыкі высокіх цэн мела месца найбольшая паўпэрызацыя працоўных сялянскіх мас. Таму, што гэты пэрыяд зьяўляецца пэрыядам узмоцненага падатковага грабежніцтва сялянскай масы, узмоцненай палітыкі зямельнага голаду сялянскіх мас, у якіх памешчыкі і кулакі рабуюць зямлю.

Вы крычыцё тут аб СССР. (Вялікі шум). Іменна СССР гэта той адзіны край, які ня ведае аграрнага крызісу і наогул гаспадарчага крызісу. (Моцныя крыкі). Сялянскія масы ў СССР, дзякуючы пралетарскай рэвалюцыі, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі Леніна, сілаю адабралі ад памешчыкаў зямлю і падзялілі гэту зямлю паміж сабою. Такім чынам, памешчыцтва было зьнішчана, узьняўся дабрабыт шырокіх сялянскіх мас. (Вялікі шум. Голас: Галеча). Шпаркі ўзрост сацыялістычнай прамысловасьці дазваляе зараз уцягваць працоўныя сялянскія масы ў сацыялістычнае будаўніцтва шляхам калектывізацыі гаспадарак працоўных сялян.

Дзякуючы ўсяму гэтаму, сярод сялянскіх мас у Польшчы ўзрастае аўтарытэт СССР, растуць уплывы камунізму, нянавісьць да фашысцкага панаваньня, да сац.-фашыстых з ППС і фашыстых з «Вызваленьня» і «Сялянскай партыі». Таму сёньня камуністыя становяцца ў польскай, беларускай і украінскай вёсцы ўсё больш папулярнымі. Камуністычны рух становіцца гегемонам на вёсцы, бо сялянскія масы разумеюць, што пралетарская рэвалюцыя — гэта адзіны шлях, на якім сялянскія масы здабудуць памешчыцкую зямлю. (Шум, розныя крыкі. У часе апошніх слоў прамоўцы маршалак Дашынскі некалькі раз запальвае чырвоную лямпку, як знак, што час прамоўцы скончан. Звоніць, пасьля забірае слова ў дэпутата Жарскага. На лаўках камуністычных паслоў і ўсёй рабоча - сялянская лявіцы бурныя воплескі).

*) Тав. Жарскі, хоць і зьяўляецца паслом сойму, які нібы карыстаецца «нятыкальнасьцю», аднак, быў арыштаваны на рабочым мітынгу ў Лодзі, цапярэдадні 1-га мая і зараз сядзіць у турме.

Рэвалюцыйны пажар у Індыі разрастаецца

ШАЛАПУР У РУКАХ ПАЎСТАНЦАЎ

ЛЁНДАН, 9. Горад Шалапур у руках паўстанцаў. Ніякіх вестак адтуль за мінулыя суткі не атрымана. У баёх з паліцыяй паўстанцы праявілі выключную жорсткасьць. Многа паліцэйскіх забіта, рэшта атрымала нажавыя, агнястральныя параненьні. Паліцыі ў горадзе не засталося. Зўрапэйскія жанчыны і дзеці эвакуяваны. Бежанцы паведамляюць, што ПАЎСТАНЬНЕМ КІРУЮЦЬ БАСТУЮЧЫЯ РАБОЧЫЯ. Горад знаходзіцца ў стане грамадзянскай вайны. Колькасьць ахвяр вялізарная. Адных толькі забітых ня менш 50. Паўстанцы спалілі паліцэйскія вучасткі, пі-цейныя крамы і будынак суду. У раёне МАНАВАЛА, каля Амрытцара, паўстанцы апэруюць уздоўж палатна чыгункі, робяць напады на цягнікі, перарэзалі тэлефонныя і тэлеграфныя правады. Па ўсёй Індыі адбываюцца дэманстрацыі. Зўрапэйская вопратка спальваецца на вуліцах. Арыштаваны сакратар камітэту нацыянальнага кангрэсу. Некалькі дзеячоў кангрэсу прыгавораны да турэмнага зьняволеньня ад 2 месяцаў да 3 год. (ТАСС).

БАРЫКАДНЫЯ БАІ НА ВУЛІЦАХ ШАЛАПУРА

ЛЁНДАН, 10. Сёньня атрыманы першыя весткі аб падзеях у Шалапуры пасьля ўходу з гораду паліцыі і мясцовых улад. 7-га мая забаставала большасьць фабрык. Забастоўшчыкі да дэманстрацыі накіраваліся да 2-х фабрык, якія ня спынілі працы, каб зьняць рабочых але натыкнуліся на атрад паліцыі і ўступілі з імі ў бойку. Бастуючыя рабочыя засыпалі паліцэйскіх градам каменьняў і прымусілі іх адступіць. Пасьля гэтага пачаліся шматлюдныя дэманстрацыі, якія скончыліся разгромам паліцэйных крам.

На другі дзень пачалася дэманстрацыйная парубка пальмаў, з пладоў якіх выраблялася мясцовая гарэлка. Паліцыя, якая прыбыла на двух грузавіках, разагнала парубшчыкаў і арыштавала 6 «падбухторшчыкаў». Аднак, пры ўезьдзе ў горад адбылася сутычка з натоўпам у 2.000 чал. Натоўп акружыў грузавікі, пабудаваў барыкады і адбіў арыштаваных, уступіўшы ў барацьбу з паліцэйскімі. Неўзабаве натоўп узрос да 5.000 чал. Грузавікам удалося выбрацца на дарогу, але насельніцтва ўсіх дамоў бамбардзявала грузавікі каменьнямі. Паўстанцы перайшлі потым да актыўных нападаў на паліцэйскія вучасткі і афіцыйныя ўстановы, прычым спалілі ўсе паліцэйскія вучасткі, забілі 8 паліцэйскіх, некалькі спалілі на вогнішчы, а 2-х кінулі ў студню.

Ноччу з Амэндагары на станцыю Дэлапур прыбыў першы батальён бамбэйскіх грэнадэраў. Гэта дазволіла эвакуаваць эўрапейцаў. Спэцыяльны карэспандэнт «Дэйлі Тэлеграф», які прыбыў у Дэлапур, перадае, што абстаноўка на станцыі такая, якую можна было бачыць на фронце ў часе сусьветнай вайны. (ТАСС).

Рэвалюцыйны рух у краінах капіталу

ПРАЦОЎНАЕ СЯЛЯНСТВА ІТАЛІІ РАЗГРАМЛЯЕ ФАШЫСЦКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ

ПАРЫЖ, 7. Паводле вестак газэты «Лібэрта» з Нэапаля, у даліне Апуліі становяцца ўсё больш частымі выпадкі нападу сялян, а таксама насельніцтва ў невялікіх гарадох на мясцовыя фашысцкія арганізацыі і гарадзкія ўправы. Непасрэднай прычынай хваляваньня служыць узмацненьне падатковага дяжару. У раёне Каранто працоўнае насельніцтва напала на ўправу, выгнала з яе фашыстых і падпаліла будынак. Выкліканыя фашыстымі карабінэры страялі ў насельніцтва. Шмат параненых. Падрабязнасьці гэтых падзей адсутнічаюць. (Фашысцкай прэсе забаронена паведамляць аб гэтых і аналёгічных падзеях). (ТАСС).

Хваляваньні ў францускай армії

ПАРЫЖ, 7 Орган кампартыі «Юманітэ» паведамляе, што на борце вайсковага карабля «Кондэ» матросы наладзілі дэманстрацыю пратэсту супроць арышту марака Лятуля, у якога былі выкрыты падкінутыя яму правакатарамі антымілітарысцкія лістоўкі і экземпляр «Юманітэ». Тубыльныя салдаты 3-га артылерыйскага палка ў знак пратэсту супроць дрэннага харчу, адмовіліся прымаць удзел у заняткох. Агральцы 9-га артылерыйскага дывізіёну наладзілі дэманстрацыю пратэсту супроць жорсткага абыходжаньня. (ТАСС).

Па СССР

Пяцігодка с.-г. машынабудаўніцтва

МАСКВА, 5. Наркамзем СССР распрацаваў дырэктыву па складаньні пяцігадовага пляну с.-г. машынабудаўніцтва. Да канца пяцігодкі сельская гаспадарка РСФСР, УССР і БССР БУДЗЕ АГРАМАДЖАНА ПОЎНАСЬЦЮ, а сельская гаспадарка іншых рэспублік — ня менш 85 проц. Саўгасы рэспубліканскага значэньня да канца пяцігодзьдзя поўнасьцю забясьпечваюцца мэханічнай цягавай сілай. Калгасы будуць мэханізаваны на 85 проц. Намячаецца наступны парадак забясьпячэньня сельскай гаспадаркі трактарнай сілай. У 1930-31 годзе—2 млн. конскіх сіл. У 1931-32 годзе — 3.700.000 конскіх сіл. У 1932-33 годзе — 8.300.000 конскіх сіл.

Міжнародны энэргэтычны кангрэс

МАСКВА. У чэрвені г. г. у Бэрліне адбудзецца міжнародны энэргэтычны кангрэс, на які з'едуцца 3.000 вучоных з 50 краёў. Групы дэлегатаў кангрэсу, галоўным чынам амэрыканцы, выказалі жаданьне па скончэньні кангрэсу паехаць у Савецкі Саюз для азнаямленьня з вялізарнейшымі энэргэтычнымі пабудовамі. (ТАСС).

НЯУХІЛЬНА ВЫКОНВАЦЬ ЛЕНІНСКІ НАКАЗ—ЗМАГАЦЦА НА ДВА ФРОНТЫ

Разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку, рашуча выпраўляючы памылкі і скрыўленьні, дапушчаныя ў асобных мясцох,—мацней ударым па правым апартунізьме—галоўнай небясьпецы і „левых" загібах, па ўсялякіх спробах справа і зьлева дыскрэдытаваць бальшавіцкае кіраўніцтва ленінскай партыі

Фрунзаўская партканфэрэнцыя

Аб рабоце менскага АК

ДАКЛАД т. СЛАВІНСКАГА

Канфэрэнцыя заслухала даклад Менскага акруговага камітэту партыі. Дакладчык т. СЛАВІНСКІ спыніўся на асноўных пытаньнях работы Менскай арганізацыі за час з 7-ай акруговай партканфэрэнцыі.

Тав. Славінскі падкрэсьліў, што мінулы пэрыяд адзначан радам рашаючых дасягненьняў на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. Калі ў мінулым годзе, напрыклад, рост валавой прадукцыі па акрузе складаў 46,4 проц., дык за апошняе паўгодзьдзе валавая прадукцыя вырасла на 93,3 проц. Потым дакладчык спыніўся на пытаньнях сацыялістычнага спаборніцтва, ударнага руху і барацьбы за прамфінплян.

— На гэтым асноўным вучастку,— заявіў т. Славінскі,—мы маем асобныя прарывы. За паўгодзьдзе прамфінплян па мясцовай прамысловасьці выканан толькі на95,6 проц. Недавыканан прамфінплян па лініі дзяржаўнай прамысловасьці. Маюць месца пэўныя недахопы ў ажыцьцяўленьні адзінаначальня па лініі якасных паказальнікаў прадукцыі і г. д.

Пераходзячы да пытаньняў калгаснага будаўніцтва, т. Славінскі завастрыў увагу на барацьбе з перагібамі і скрыўленьнямі партлініі пры правядзеньні калектывізацыі. Дакладчык адзначыў, што ў акрузе ў радзе раёнаў дапушчаны антысярэдняцкія перагібы і грубыя скажэньні лініі партыі. У Грэскім раёне, напрыклад, «раскулачвалі» серадняка. У гэтым напрамку трэба адзначыць рад іншых раёнаў. (Плешчаніцы, Самахвалавічы і г. д.), дзе мясцовыя работнікі, адчуваючы моцнае «головокружение от успехов», скрыўлялі партыйную лінію. Хаця дапушчаныя перагібы і памылкі ў асноўным выпраўляюцца, аднак, некаторыя работнікі праяўляюць недапушчальную маруднасьць і двурушніцтва ў выпраўленьні ўласных памылак.

Мы таксама—сказаў т. Славінскі,—дапусьцілі некаторыя памылкі ў пытаньнях калектывізацыі. На студзеньскім пленуме АК КП(б)Б мы паставілі перад арганізацыяй задачу—мець да вясны калектывізаваную плошчу ў 40 проц. Гэта зьяўляецца памылкай, якая, па сутнасьці, спрыяла некатораму «головокружению». Мы прызнаём таксама,—сказаў т. Славінскі,—сваёй памылкай тое, што прызналі Капыльскі і Сьмілавіцкі раёны ў нашай акрузе раёнамі суцэльнай калектывізацыі.

У свой час мы прынялі выклік Мазырскага АК КП(б)Б уступіць у сацыялістычнае спаборніцтва па калектывізацыі. Гэта, бясспрэчна, зьяўляецца нашай памылкай. Заўважваючы, што асобныя раёны без адпаведнай падрыхтоўкі і патрэбнай базы фарсавалі тэмпы калектывізацыі, мы ня ўжылі своечасовых мер, каб спыніць гэта «головокружение». Напрыклад, Вузьдзенскі раён парашыў скончыць калектывізацыю да вясны г. г. Мы бачылі, што тут калектывізацыя праводзіцца бяз уліку канкрэтных умоў і магчымасьцяй, але ня выправілі памылковай лініі вузьдзенскіх работнікаў. У гэтым напрамку мы прызнаем сваю памылку.

Далей,—гаворыць т. Славінскі,—наша прэса ў пытаньнях калектывізацыі часамі няправільна арыентавала ў сваіх асобных артыкулах партыйную масу (у прыватнасьці газэты «ЗЬВЯЗДА»).

Пленум Менскага АК КП(б)Б, які скончыўся гэтымі днямі, рашуча асудзіў усе вышэй адзначаныя памылкі. Пленум скасаваў асобныя няправільныя пастановы, ухваленыя мінулым пленумам АК КП(б)Б. Дакладчык падкрэсьліў, што чарговая задача партарганізацыі заключаецца ў тым, каб, хутка і рашуча выпраўляючы памылкі, разгарнуць калгаснае будаўніцтва на аснове дырэктыў партыі і ў тэрмін па-бальшавіцку скончыць веснавую сяўбу.

Закранаючы пытаньні барацьбы за лінію партыі, т. Славінскі падкрэсьліў, што Менская арганізацыя пасьлядоўна ўзмацняе барацьбу на два фронты як з правым ухілам—галоўнай небясьпекай, так і з «левым» апартунізмам. Дакладчык адзначыў непрымірымую барацьбу Менскай партарганізацыі з нацыянал-апартунізмам, з нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў. У заключэньне тав. Славінскі выказаў цьвердую ўпэўненасьць, што Менская арганізацыя, пад кіраўніцтвам ЦК, разгортваючы бальшавіцкую самакрытыку, здолее выканаць пастаўленыя перад ёю задачы па барацьбе на два фронты, па барацьбе за прамфінплян, за калектывізацыю вёскі, за ліквідацыю кулацтва, як клясы, на базе суцэльнай калектывізацыі.

***

Па дакладу т. Славінскага разгарнуліся ажыўленыя спрэчкі. Дэлегаты канфэрэнцыі ў сваіх выступленьнях закраналі ўсе моманты і пытаньні з работы Менскага АК і акруговай партарганізацыі.

Тав. АЛЕКСАНДРОВІЧ адзначыў, што Менская арганізацыя правяла вялікую барацьбу з нацыянал-апартунізмам, нацыянал-дэмакратызмам і шавінізмамі ўсіх колераў. Рашучасьць, праяўленая Менскай арганізацыяй у барацьбе з нацыянал-дэмакратычнымі выпазкамі (БДВ, справа М. Зарэцкага і г. д.) сьведчыць аб тым, што партыйная арганізацыя непрымірыма змагалася за лінію партыі. Тав. Александровіч прызнаў перад партыйнай канфэрэнцыяй памылкі, дапушчаныя ім у пытаньнях барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам. Потым т. Александровіч спыніўся на асобных прарывах на ідэалёгічным фронце. Прадукцыя Белдзяржкіно яшчэ не адпавядае нашым задачам. Гаворачы аб пытаньнях літаратурнага фронту, прамоўца падкрэсьліў, што БелАПП здолеў правесьці вялікую барацьбу з нацыянал-дэмакратычнымі і нэабуржуазнымі плынямі ў літаратуры.

Тав. ШАПІРА канстатаваў, што Менскі акругком праводзіць правільную палітычную лінію. Аб гэтым сьведчыць тая вялікая роля, якую адыграў АК партыі ў барацьбе з праваапартуністычным ухілам, у барацьбе супроць нацыянал-дэмакратызму. Потым прамоўца гаварыў аб барацьбе за прамфінплян. Тав. Шапіра падаваў факты нясур'ёзных адносін да сацыялістычнага спаборніцтва. Ён заявіў, што мы павінны ўзмацніць барацьбу з ілжэ-ўдарніцтвам. На адным з прадпрыемстваў сярод прагульшчыкаў аказалася 67 проц. «ударнікаў». Далей т. Шапіра адзначыў, што прафсаюзныя арганізацыі невыстарчальна перабудоўваюць сваю работу. У прафсаюзах мы ня бачым карэннага і глыбокага пералому.

Тав. САЗОНАЎ завастрыў увагу канфэрэнцыі на пытаньнях партвучобы. Як гэта ня дзіўна,—сказаў прамоўца,—аднак, на гэтым вучастку мы маем сур'ёзныя недахопы. Частка партыйных школ на сёньня распалася. Узмацненьне партвучобы павінна стаць нашай ударнай баявой задачай.

Тав. КІРЫЛЬЧЫК гаварыў аб прамфінпляне і новым будаўніцтве. Прамоўца падаў факты, калі ў будаўніцтве новых прадпрыемстваў маюць месца буйныя прарывы.

Тав. ЧАХОЎСКІ таксама завастрыў увагу на недахопах будаўніцтва. Розныя непарадкі часамі моцна перашкаджаюць выкананьню пляну будаўніцтва (напрыклад, на Эльводзе).

Тав. ТЫНПІДУС гаварыў аб рабоце шэфскіх арганізацый. Акруговы шэфскі камітэт працуе слаба. Да гэтага часу шэфскія арганізацыі не разварушыліся і ня прымаюць сапраўднага ўдзелу ў калгасным будаўніцтве.

Тав. НЕКРАШЭВІЧ, гаворачы аб барацьбе з нацыянал-дэмакратычнымі плынямі, спыніўся на асобных прарывах на культурным фронце. Прамоўца заявіў, што партыйная арганізацыя павінна ўзмацніць сваю работу ў выкананьні дырэктыў партыі аб беларусізацыі. Рад іншых таварышоў закраналі пытаньні калгаснага будаўніцтва барацьбы за прамфінплян, адзінаначальня і г. д., і г. д.

***

Канфэрэнцыю вітала дэлегацыя інжынэрна-тэхнічных работнікаў. Дэлегацыя рабочых фабрыкі імя ВАРОЎСКАГА рапартавала канфэрэнцыі аб выкананьні прамфінпляну. Дэлегацыя заявіла, што фабрыка выканала прамфінплян на 103 проц. З адказам на прывітаньні ад імя канфэрэнцыі выступіў т. КУРЦІК.

***

Канфэрэнцыя заключыла САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ДАГАВОР з раённай партыйнай арганізацыяй імя ДЗЯРЖЫНСКАГА (Гомель) на лепшую пастаноўку партработы.

Скрыўленьне партлініі ў аршанскай арганізацыі

Камісія ЦКК КП(б)В абсьледвала работу Аршанскай партарганізацыі па калгасным будаўніцтве. Абсьледваньне выкрыла цэлы рад скрыўленьняў партыйнае лініі ў пытаньнях калектывізацыі *). У асобных раёнах Аршаншчыны мелі месца антысярэдняцкія перагібы, масавая работа была падменена бюракратычным адміністраваньнем, парушаўся прынцып добраахвотнасьці калгаснага руху.

Наступныя факты добра паказваюць наколькі ў Аршанскай партарганізацыі некаторыя работнікі злачынна скажалі лінію партыі. У прыватнасьці трэба адзначыць Ляднянскі раён. Сакратар Ляднянскага райкому Байдакоў змайстраваў рэзалюцыю наступнага зьместу:

«Мы, грамадзяне, такой-та вёскі заяўляем, што тыя сяляне, якія вядуць работу і выступаюць супроць калектывізацыі і, у прыватнасьці, супроць суцэльнай калектывізацыі нашага раёну—зьяўляюцца ворагамі савецкае ўлады, ворагамі рабочае клясы і бяднякоў-серадняцкіх мас сялянства. Таму сход просіць РВК прыняць у адносінах да такіх асоб самыя рашучыя меры аж да высяленьня іх з раёну». Гэта рэзалюцыя потым прапанавалася ўсім бяднякам-серадняцкім сходам па пытаньні калектывізацыі. Ляднянскія ўра-калектывізатары на чале са сваім сакратаром прымушалі сялян уступаць у калгасы, практыкавалі складаньне сьпісаў («хто ў калгас, а хто ў Салаўкі») і г. д. Груба ігнаруючы дырэктывы партыі аб тым, што арцель зьяўляецца асноўнаю формаю калектывізацыі, ляднянскія кіраўнікі бралі стаўку на арганізацыю «камун-гігантаў». Раскулачваньне ў Ляднянскім раёне мэханічна пераносілася на серадняко ў. У раёне адзначаны цэлы рад фактаў «раскулачваньня» серадняцкіх гаспадарак. У Ляднянска-Дуброўенскім агра-індустрыяльным камбінаце дапушчаны самыя грубыя памылкі пры абагуленьні насеньня і жывёлы. «Калектывізатары» з камбінату прымушалі вакольных серадняко ў адразу ўступаць у камуну.

Факты, якія мелі месца ў Ляднянскім раёне не зьяўляюцца выключэньнем. Амаль ва ўсіх раёнах, якія абсьледваны камісіяй ЦКК, адзначаны факты праваапартуністычнай практыкі і «левых» перагібаў. Як правіла, у гэтых раёнах няма ніякай работы сярод батрацка-бяднацкіх мас. Антысярэдняцкія перагібы («раскулачваньне» і індывідуальнае абкладаньне серадняко ў), якія практыкаваліся ў гэтых раёнах, вельмі часта цесна перапляталіся з прымірэнчымі, прыхільнымі адносінамі мясцовых работнікаў да кулакоў. «Раскулачваючы» асобных серадняко ў і нават беднякоў, некаторыя раённыя работнікі Аршанчыны адкрыта абаранялі кулацкія элемэнты.

У Аршаншчыне асобныя калгасы імкнуцца падмяняць сабою сельскія саветы. Партыйныя арганізацыі ў большасьці такіх выпадкаў цягнуліся ў хвасьце. Нельга моўчкі абыйсьці таксама тое, што ў Аршанскай акрузе, у радзе месц, дапушчаны абураючыя скажэньні пры зямляўпарадкаваньні ў адносінах да індывідуальных бяднацка - серадняцкіх гаспадарак.

З усімі гэтымі перагібамі і скажэньнямі кіраўнічыя раённыя, партыйныя і савецкія органы, як адзначыла камісія ЦКК, змагаліся нерашуча і невыстарчальна. Пытаньне аб барацьбе са скрыўленьнямі партыйнай лініі ня было узьнята на прынцыповую вышыню і пасьля артыкулу т. Сталіна і пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15-га сакавіка. Кіраўнічыя парторганы акругі і раёнаў не паставілі рашуча пытаньня аб барацьбе з перагібшчыкамі і скрыўленьнямі, аб неадкладным выпраўленьні дапушчаных памылак. Акругком партыі з свайго боку нерашуча змагаўся з праваапартуністычнай практыкай і «левымі» загібамі.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што Аршанскі АК КП(б)В не забясьпечыў выкананьня дырэктыў партыі аб рабоце з батрацка-бяднацкімі масамі. У гэтым напрамку акругком ня здолеў дабіцца выстарчальнага пералому. Пры правядзеньні калектывізацыі бюро Аршанскага АК несваячасова і нерашуча рэагавала на праваапартуністычныя скажэньні і «левыя» перагібы. Бюро не паставіла перад партыйнай арганізацыяй задачы неадкладна ліквідаваць перагібы. Ляднянскі, Расьнянскі і інш. раённыя парткамітэты ў барацьбе са скажэньнямі за выпраўленьне памылак і перагібаў праявілі недапушчальную маруднасьць і палавіннасьць. На райпартсходах Ляднянскай, Расьнянскай і г. д. арганізацый асобныя партыйцы выступалі з яўна антыпартыйнымі шкодніямі «тэорыйкамі». Гэтыя апартуністыя імкнуліся замазаць свае ўласныя злачынныя памылкі, заяўляючы, што «ва ўсім вінаваты ЦК» і г. д. На асобных райпартсходах мелі месца адкрытыя выступленьні апартуністых супроць дырэктыў ЦК УсеКП(б) і супроць артыкулаў тав. Сталіна. Райпарткомы, добра ведаючы аб гэтых выступленьнях, не прыцягнулі да адказнасьці іх аўтараў, пашкадаваўшы апартуністых, якія адкрыта, ці замаскавана імкнуліся дыскрэдытаваць партыйнае кіраўніцтва.

Паказальна, што сакратар АК КП(б)В т. ВІЛЯНСТОВІЧ, атрымаўшы ліст ад аднаго сакратара РК аб грубых скажэньнях партыйнай лініі, абмежаваўся на сутнасьці бюракратычнай рэзалюцыяй, у якой толькі прапанаваў тэхсакратару азнаёміць двух членаў бюро АК з дасланымі яму матар'ёламі.

Мы канстатуем, што Аршанскі АК ігнаруе і парушае дырэктыву Цэнтральнага Камітэту УсеКП(б) аб тым, каб работнікаў, якія не прызнаюць і не выпраўляюць сваіх памылак і перагібаў зьнімаць з пастоў і замяняць другімі. Фактычна на сёньнешні дзень у акрузе і ў раёнах застаюцца на кіраўнічай рабоце асобы, якія скажалі партыйную лінію. Калі-ж АК і зьнімаў з пастоў асобных работнікаў за скрыўленьні і перагібы, дык гэтыя работнікі праз некаторы час прызначаліся на іншую адказную работу. У Горацкім раёне былі зьняты з работы старшыня РВК Бажанаў і работнік РК Гракаў. Аднак, праз некалькі дзён Аршанскі АК паслаў іх на адказную партыйную і савецкую работу.

У акрузе яшчэ да гэтага часу не скончаны перавод калгасаў на статут с.-г. арцелі. У Ляднянскім і Мсьціслаўскім раёнах гэта работа праходзіла мэханічна, без папярэдняй работы з батрацтвам і беднатой, бяз пырокага растлумачэньня калгаснікам статуту с.-г. арцелі. Бядняцка-серадняцкія масы да сёньняшняга дня ня ведаюць пастаноў аб ільготах калгасам.

***

Аршанская партыйная арганізацыя павінна хутка і рашуча ліквідаваць дапушчаныя скрыўленьні і рашуча ўдарыць па праваапартуністычнай практыцы і «левых» перагібах.

М.

*) Пастанова ЦКК па гэтым пытаньні будзе зьмешчана ў бліжэйшым нумары «Зьвязды».

З пастановы бюро ЦК КП(б)Б

аб рабоце 2-й віцебскай гарадзкой райпартарганізацыі

Бюро ЦК КП(б)В заслухала даклад сакратара 2-га райкому тав. Ігнатовіча і судаклад адказнага інструктара ЦК тав. Равінскага аб рабоце 2-й раённай партарганізацыі (Віцебск). Бюро ЦК канстатавала, што, становішча арганізацыі ў асноўным зьяўляецца здаровым. Аднак у рабоце партарганізацыі мае месца рад буйнейшых недахопаў.

ЦК адзначыў, што «парткіраўніцтва раёну не забясьпечыла пасьпяховага выкананьня прамфінпляну, ня здолела мабілізаваць і накіраваць рабочую актыўнасьць на выкананьне колькасных і якасных паказальнікаў прамфінпляну».

ЦК адзначыў, што ў раёне прамфінплян за першае паўгодзьдзе ня выкананы на 4 проц. Якаснае выкананьне прамфінпляну, як палкрэсьлівае ЦК, таксама нездавальняючае.

—З боку райкому і райпартарганізацыі, асабліва ў першым квартале не завастралася ўвага на гаспадарчых прарывах на буйнейшых прадпрыемствах. Райком ня даў рашучага адпору імкненьню схавацца за аб'ектыўныя прычыны.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі, адзначаецца ў рэзалюцыі ЦК, невыстарчальна кіравалі сацыялістычным спаборніцтвам і ўдарным рухам.

— Большая частка партыйцаў і камсамольцаў усё яшчэ стаяць у баку ад сацспаборніцтва і ўдарніцтва. З боку асобнай часткі камуністых назіраецца супраціўленьне разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарнага руху, правядзеньню рацыяналізацыі і добраахвотнага зьніжэньня расцэнак (справа Бараноўскай).

— Адзінаначальне праведзена ў раёне зусім слаба. З боку адміністрацыйнага і тэхнічнага пэрсаналу ёсьць імкненьні зьнімаць з сябе адказнасьць за пасьпяховае выкананьне прамфінпляну. Адзначаючы значны прарыў у выкананьні прамфінпляну. бюро ЦК даручыла 2-му райкому і раённай партарганізацыі прыняць рашучыя меры да выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну з тым, каб у трэцім квартале поўнасьцю выканаць праграму і пакрыць прарыў за першае паўгодзьдзе. ЦК завастрыў увагу на патрэбе палепшыць якасьць прадукцыі.

ЦК запрапанаваў райкому забясьпечыць пагалоўны ўдзел партыйцаў і камсамольцаў у сацыялістычным спаборніцтве і ўдарным руху, рашуча ўдарыць па тых камуністых, якія зрываюць рацыяналізацыю, шырэй разгарнуць справу рацыяналізацыі на прадпрыемствах, забясьпечыць масавасьць і сыстэматычную работу вытворчых нарад, поўнае і своячасовае правядзеньне ў жыцьцё ухваленых рабочых прапаноў і вынаходніцтваў і г. д. і г. д.

Райкому, гаспадарчым і прафсаюзным органам запрапанавана ў месячны тэрмін давесьці прамфінплян да кожнага цэху, да асобных брыгад і варштатаў.

ЦК канстатаваў, што райком і райпартарганізацыя не забясьпечылі выстарчальнага разгортваньня бальшавіцкай самакрытыкі ў раёне, не накіравалі самакрытыкі на палянішэньне гаспадарчай і партыйна-масавай работы. Бюро ЦК даручыла 2-му райкому і райпартарганізацыі ў далейшым рашуча разгарнуць самакрытыку, ня гледзячы на асобы, рашуча весьці барацьбу з усялякімі зацікамі самакрытыкі, узмацніць парткіраўніцтва друкам і рабкорамі і г. д. і г. д.

Прафсаюзныя арганізацыі на прадпрыемствах, гаворыцца далей у рэзалюцыі бюро ЦК, усё яшчэ не перабудавалі сваёй работы. Важнейшыя пытаньні прамфінпляну і вытворчых праграм праходзяць міма прафсаюзных арганізацый. Прафсаюзы не вядуць штодзённай работы са старымі кадрамі рабочых. ЦК запрапанаваў партыйнай і прафсаюзнай арганізацыям раёну зьвярнуць асаблівую ўвагу на пытаньні сыстэматычнага абслугоўваньня новых груп рабочых, а таксама больш рашуча ўцягваць у грамадзкую і масавую работу інжынэрна-тэхнічны пэрсанал раёну. ЦК завастрыў увагу на патрэбе дабіцца карэннага пералому ў рабоце прафсаюзных органаў на прадпрыемствах.

РК і прафсаюзным органам запрапанавана больш плянава праводзіць вылучэньне рабочых, весьці вялікую падрыхтоўчую работу, пэрыядычна інструктаваць і дапамагаць вылучэнцам, дабіцца рашучага пералому ў вылучэньні работніц і г. д.

ЦК канстатаваў, што «райком і райпартарганізацыя невыстарчальна займаліся нацпытаньнямі ў раёне, не даацэньвалі ўсёй палітычнай важнасьці правядзеньня нацпалітыкі, невыстарчальна праводзілі барацьбу з выпадк

У рабоце сярод беднаты яшчэ няма патрэбнага пералому

Праваапартуністычнай недаацэнцы значэньня самастойнай арганізацыі беднаты і батрацтва павінен быць даны рашучы адпор

Узмацненьне батрацка-бядняцкіх груп замацуе саюз з серадняком супроць кулака

У студзені ЦК КП(б)Б канстатаваў, што «работа па сыстэматычнай і самастойнай арганізацыі беднаты і батрацтва праходзіць нездавальняюча».

ЦК патрабаваў самай рашучай барацьбы з яскравай праявай правага ухілу—недаацэнкай значэньня работы сярод беднаты і батрацтва.

Ня гледзячы на гэтыя катэгарычныя указаньні вышэйшых партыйных органаў, у радзе раёнаў у гэтай важнейшай палітычнай рабоце няма яшчэ пералому. Аб гэтым сьведчаць матар'ялы абследаваньня, праведзенага Калгасцэнтрам. Дырэктывы ЦК КП(б)Б аб узмацненьні работы сярод батрацтва і беднаты ў вясковых парт'ячэйках ня ўсюды распрацоўваліся. У выніку ў некаторых месцах ня толькі беспартыйная маса батрацтва і беднаты, але і частка партыйцаў—членаў калгасаў і нават некаторыя кіраўнікі груп беднаты яшчэ не разумеюць важнасьці і значэньня разгортваньня самастойнай работы сярод батрацтва і беднаты.

Так, напрыклад, у калгасе Сваташыцкага сельсавету (Дубровенскі раён) член праўленьня і агранам (кандыдат у члены КП(б)Б) зазначалі:

«Калі мы створым батрацка - бядняцкія групы ў калгасе, дык мы гэтым разлем калгасьнікаў. Зараз-жа ўсе мы апынемся на адпалькавых правых».

У Горацкім раёне, у калгасе «Чырвоны Ўсход», члены праўленьня на прапанову аб стварэньні групы адказалі—«ня трэба нам дзяленьня».

Член праўленьня арцелі імя Леніна і старшыня сельсавету (Журавіцкі раён) член КП(б)Б прытрымліваецца такіх поглядаў:

«Пры арганізацыі батрацка - бядняцкай групы ў калгасе мы будзем мець нездаваленьне з боку серадняцтва. Створыцца разрыў паміж беднатой і серадняцтвам. Таму ў склад групы беднаты трэба ўвесьці таксама серадняцкі актыў калгасу, тым больш, што сама бедната нічога ня зробіць: сёньня пастановіць, а заўтра скасуе».

Зусім ясна, што ўсе гэтыя праваапартуністычныя заявы аб «непатрэбнасьці» і «немагчымасьці» работы сярод беднаты на справе ударяюць па саюзу з серадняком. Узмацняючы арганізацыі беднаты—гэтай нашай апоры на вёсцы, мы ўмацоўваем саюз з серадняком супроць кулака.

Работа з батрацтвам і беднатой да гэтага часу праводзілася некаторымі РК і ячэйкамі на мясцох без належнага кіраўніцтва і плянавасьці. Ні ў акркалгассаюзах і райсаюзах, ні ў РК і ячэйках няма ўліку, што зроблена ў гэтай галіне. Сходы беднаты склікаліся галоўным чынам для абмеркаваньня тых ці іншых кампанейскіх пытаньняў. Вабаўнянская ячэйка (Копыльскі раён), напрыклад, на працягу 4 зімовых месяцаў правяла 26 сходаў беднаты, але сярод беднякоў - калгасьнікаў быў праведзен толькі адзін сход.

Беднякі ў сваёй пераважнай колькасьці прымалі актыўны ўдзел у раскулачваньні і вопісі кулацкай маемасьці. Аднак, там, дзе не праводзілася праца з беднатой, дзе бядняцкія групы ў калгасах ня былі арганізаваны, пры раскулачваньні былі дапушчаны перагібы і злоўжываньні.

У такіх мясцох яшчэ да гэтага часу ня ўлічана кулацкая маемасьць і ня ўнесена ў непадзельныя фонды калгасаў. Ёсьць выпадкі, калі кулацкая маемасьць знаходзіцца ў карыстаньні сялян - індывідуальнікаў. (Сураж, Лёзна). Адзначаны факты, калі, з прычыны адсутнасьці актаў, нельга ўстанавіць, што іменна адабрана ў таго ці іншага кулака на карысьць калгасу. Усё гэта сьведчыць аб тым, што некаторая частка кулацкай маемасьці была скарыстана для спажывецкіх патрэб. У калгасе «Бязбожнік», Лёзьнянскага раёну (Віцебшчына), напрыклад, члены праўленьня калгасу нават скарысталі для асабістых мэтаў кулацкія спажывецкія прадукты

З прычыны слабай работы з беднатой, у некаторых калгасах беднота і батрацтва ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў арганізацыйнай рабоце і замацаваньні гаспадарчага становішча калгасу. Гэтым тлумачацца і выпадкі, калі частка беднаты салідарызуецца з элемэнтамі ў калгасах, якія хістаюцца. У процівагу такому зьявішчу, там, дзе работа сярод беднаты праводзілася рэгулярна, дзе батрацка - бядняцкія групы ўцягнуты ў актыўнае будаўніцтва калгасаў, наглядаецца прыліў у калгасы тых сялянскіх гаспадарак, якія раней адтуль выйшлі. Так, калгас «Чырвоны Ельск», Мазырскай акругі раней налічваў 37 гаспадарак. Калі прыступілі да палявых работ, у калгас улілося яшчэ 112 гаспадарак. У калгасе «Кастрычнік», Дубровенскага раёну да пачатку красавіка месяца з 33 гаспадарак засталося толькі 12. Пасьля разгортваньня работы з беднатой і растлумачэньня прадастаўленых калгасам ільгот, амаль усе гаспадаркі вярнуліся ў калгас.

Батрацка - бядняцкія групы ў значнай частцы калгасаў яшчэ не аформлены. Абследваньне паказала, што весткі райкомаў аб колькасьці груп не адпавядаюць сапраўднасьці.

Так, у Копыльскім раёне (Меншчына) замест 3-х паказаных груп у наяўнасьці аказалася толькі адна. Гэта група за паўтара месяца ні разу ня зьбіралася, прычым некаторыя беднякі нават ня ведаюць аб тым, што яны ўваходзяць у групу.

Некаторыя кіраўнікі груп зазначаюць, што яны ня ведаюць, як ім трэба працаваць.

Ёсьць выпадкі, калі групы падменьваюцца агульнымі сходамі беднаты. У калгасе «Ленінка» (Аршанская акруга) у групу былі залічаны ўсе 55 членаў калгасу — беднякі. А ў калгасе «Згода» (Быхаўскі раён) наадварот, у групу былі запісаны ўсе так званыя вытрыманыя беднякі у колькасьці 15 асоб. Пры гэтым з пасяджэньняў групы выдаялі ня толькі сераднякоў, але і ўсіх тых беднякоў, якія не ўвайшлі ў склад групы. Праўленьне калгасу, Сваташыцкага куста (Дубровенскі раён), замест разгортваньня самастойнай работы з групай, абмяжоўваецца тым, што запрашае членаў групы для прыняцьця ўдзелу ў работах на пасяджэньнях праўленьня (такія зьявішчы практыкуюцца і ў цэлым радзе іншых калгасаў).

Усе гэтыя факты сьведчаць, што ў радзе калгасаў групы створаны толькі фармальна.

Паводле вестак ЦП саюзу с.-г. рабочых, лік уцягнутых у калгасы батракоў складае каля 24.000 асоб. Аднак, у правільнасьці гэтых лічбаў прыходзіцца сумнявацца. Так, наперакор паказаньням ЦП саюзу аб наяўнасьці ў 11 раёнах Менскае акругі 2.834 калгасьнікаў-батракоў, райкалгассаюзы паказваюць лічбу толькі ў 1.390 чалавек, г. зн. у два разы меншую. З матар'ялаў абсьледваньня відаць, што скарыстаньне сродкаў, адпушчаных на каапэраваньне і авансаваньне батракоў, праходзіць вельмі марудна. Часта гэтыя сумы выдаткаваны толькі на 10-20 проц. Зафіксаваны таксама выпадкі, калі калгасы гэтых сродкаў не бяруць таму, што яны зьяўляюцца кароткатэрміновым крэдытам. Пры гэтым некаторыя раёны скарыстоўваюць батрацкія крэдыты наогул для аказаньня дапамогі беднякам-калгасьнікам, якія знаходзяцца ў дрэнным матар'яльным становішчы.

У галіне вылучэньня батракоў на кіруючую работу ў калгасах наглядаюцца некаторыя дасягненьні, але зусім нязначныя. Напрыклад, у калгасе «Новы Сьвет», Віцебскай акругі, з ліку 120 батракоў - калгасьнікаў у праўленьне ўваходзіць толькі адзін батрак.

У заключэньне трэба адзначыць, што значэньне работы сярод батрацтва і беднаты ў калгасах недаацэньваецца самой калгасна - каапэрацыйнай сыстэмай. Апошняя вельмі мала займалася гэтым пытаньнем. Дырэктывы партыі і ўраду ў гэтай галіне да масы калгасьнікаў амаль што не даведзены.

Толькі ў самыя апошнія часы акруговыя калгассаюзы пачалі сёе-тое рабіць у даным кірунку. У радзе округ, хаця са спазьненьнем, але ўжо вылучаны асобныя інструктары па рабоце з беднатой (Віцебск, Ворша, Магілеў, Мазыр). Аднак, сярод працаўнікоў акруговых спэцыяльных саюзаў і паасобных партыйцаў яшчэ і зараз пашыраны такія настроі:

«З прычыны недахвату працаўнікоў зараз ня можа быць і гутаркі аб тым, каб у акруговых і раённых саюзах мець спэцыяльных інструктароў па гэтай рабоце» (Аршанскі акркалгассаюз).

Абсьледваньне паказала, што вылучаныя ў нязначнай колькасьці раёнаў інструктары па рабоце сярод батрацтва і беднаты ўвесь час скарыстоўваюцца ў якасьці ўпоўнаважаных РВК па розных кампаніях.

У рабоце сярод беднаты неабходна дабіцца карэннага пералому. Трэба палажыць канец ігнараваньню важнейшых партыйных дырэктыў аб самастойнай арганізацыі беднаты ў некаторых раёнах.

Н. А.

Сельсавет, які дапамагаў кулаком

ЧЭРЫКАЎ. (Наш кар.). Гэтымі днямі ў Зябеньскім сельсавеце, Чэрыкаўскага раёну, былі выкрыты 23 кулацкія гаспадаркі, якія аж з 1917 году і да апошняга часу ўтойвалі ад ападаткаваньня 1.083 дзесяціны пахаці. Была ўтоена таксама вялікая колькасьць жывёлы.

Выкрыта, напрыклад, кулацкая гаспадарка Драбкіна Карнея, які мае 41 дзесяціну зямлі, 6 кароў і 3 коняй. Ён стала трымаў батракоў. Падатку плаціў усяго 18 руб.

Дзямідзенка Паўлюк уладае 30 гэктарамі зямлі, мае 4 кароў, 2 коняй і вятрак.

Клімаў Міхась зямлі мае 35 гэктараў, коняй 4 і кароў 6.

Шурчанкоў зямлі мае 30 гэктараў, а ўлічана толькі 3,7 гэктараў. У яго-ж ёсьць 23 вульлі пчол, падатку плаціў толькі 10 руб. Усе яны карысталіся наёмнай сілай.

Зябеньскі сельсавет, які дапамагаў утойваць гэту зямлю ад абкладаньня, быў цалкам кулацкім. Членам яго зьяўляліся ня толькі кулакі, але і жонкі расстраляных бандытаў. Старшыня сельсавету Васіленка быў непасрэдным кулацкім агентам. Ён дапамог кулаком Петачэнкавым захаваць ад раскулачваньня маемасьць і падбухторваў кулакоў выступаць супроць калектывізацыі.

Чэрыкаўскаму райкому КП(б)Б трэба зрабіць належныя палітычныя вывады з гэтай справы.

Першая ўсебеларуская...

Камароўка калісьці была адсталай ваколіцай, акружанай істужкай лясоў. Гады рэвалюцыі зьмянілі яе аблічча. Старэйшыя ў раёне прадпрыемствы — завод «Дрэваапрацоўшчык» — вырас, значна пашырыў свае карпусы і задае тон усёй Камароўцы. Трамвай яшчэ больш ажывіў раён.

Зараз на Камароўцы будуецца новы культурны Менск, на былых пустках ствараецца асяродак навукова-дасьледчай работы Савецкай Беларусі. Ужо вырасьлі першыя карпусы клінічнага гарадка, будуюцца Акадэмія Навук, вышэйшая тэхнічная навучальная ўстанова, цэнтральны стадыён.

За адзін кілёмэтр ад заводу «Дрэваапрацоўшчык» і 3-4 кілёмэтры ад Ленінскай вуліцы на малапраходным месцы, усеяным карчамі, вырастае нябачаны яшчэ ў Беларусі новы гарадок—першая ўсебеларуская выстаўка сельскай гаспадаркі і прамысловасьці.

Яшчэ далёка ад тэрыторыі яе адкрываецца від на выстаўку. Дзесяткі павільёнаў, быццам выразаных рукой мастака, раскіданы па тэрыторыі ў мастацкім непарадку, але з захаваньнем генэральнага пляну.

Тэрыторыя выстаўкі—вялізарная. Яна займае плошчу ў 75 гэкт.

Выстаўка зьявіцца грандыёзнай калектыўнай дэманстрацыяй дасягненьняў рабочых і асноўных мас сялянства БССР у галіне сельскай гаспадаркі, прамысловасьці і культуры за гады Кастрычніцкай рэвалюцыі, паказальнікам вышэйшай тэхнікі прамысловасьці і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Выстаўка будзе мець вялікае палітычнае і эканамічнае значэньне яшчэ і тым, што там у рэчавым афармленьні будуць всытаўлены ня толькі вынікі нашых дасягненьняў, але паказаны шляхі вырашэньня тых задач, якія практычна выцякаюць з дырэктыў партыі і ўраду ў галіне рэканструкцыі нашай краіны.

Дзесяткі тысяч экскурсантаў, якія наведаюць выстаўку, убачаць, якім чынам рабочыя і бядняцка-серадняцкія масы Савецкай Беларусі, дзякуючы Кастрычніцкай рэвалюцыі, дабіліся грандыёзных эканамічных і культурных посьпехаў.

***

На тэрыторыі выстаўкі кіпіць ліхаманкавая работа. Як з-пад зямлі з усіх бакоў вялізарнай тэрыторыі вырастаюць прыгожыя будынкі. Ужо пабудавана некалькі дзесяткаў павільёнаў. Усяго іх будзе каля 40.

У адзнаку ад іншых выставак—4/5 тэрыторыі ўсебеларускай выстаўкі будуць займаць жывыя экспанаты, якія штодзенна паступаюць з самых далёкіх куткоў Беларускай ССР. Закладзена 18 севазваротаў, сад на 9 гэктараў, розныя рассаднікі с.-г. і лясного значэньня, агароды і рад новых розных культур, якія культывуюцца ў Амэрыцы, Аўстраліі і інш. краінах. 22 гэкт. адведзены для машына-спробнай станцыі. Ужо зазеляцелі палі выстаўкі. 5 агранамаў са спэцыяльным пэрсаналам клапатліва сочаць за кожным вучасткам.

Работа вялікая, новая, удзячная.

***

Урад БССР даў дырэктыву — да 15-га мая скончыць пабудову ўсіх павільёнаў. Белдзяржбуд даў шматлікія абяцаньні, што дырэктыва ўраду будзе выканана. Засталіся лічаныя дні і ўсё-ж такі да вызначанага тэрміну 15-га мая будаўніцтва выстаўкі ня будзе скончана. Работы яшчэ вельмі многа. Не распачата нават будаўніцтва павільёнаў Белдзяржвыдавецтва, рыбалоўства, сталоўкі на 5.000 чалавек і інш. Ня прыступлена нават да расстаноўкі экспанатаў, мантажных работ, пасадкі клюмбаў і кветак.

У чым асноўныя прычыны? У невыстарчальным тэмпе работы.

Белдзяржбуд прамігрэў зіму. Ён ня выкарыстаў зімовага часу для падвозкі матар'ялаў і разгортваньня будаўніцтва. Замест соцень рабочых працавалі дзесяткі.

Тэмп работы і зараз невыстарчальны, ня гледзячы на тое, што на выстаўцы занята ўжо каля 600 рабочых. Плян выканаў ня больш, як на 70-75 проц.

Паўвільёнаў выклікала цэлы рад прарываў ва ўсёй іншай рабоце. Тэрыторыя набіта ўсякімі адкідамі матар'ялаў, дошкамі. Тысячы экспанатаў пазаводзтва ў непарадку навалены ў адным будынку і разьядаюцца пацукамі.

Не сьпяшаецца і Эльвод, які яшчэ даўгэтуль ня скончыў пракладку водаправоду. Адсутнасьць патрэбнай колькасьці вады не дае магчымасьці паліваць расьліны і наогул абслугоўваць будаўніцтва. Прыходзіцца за вярсту і больш вазіць ваду на выстаўку бочкамі, на што трацілася шмат сродкаў і сіл.

***

Адным з хваравітых месц зьяўляецца недахват матар'ялаў. Частка матар'ялаў, якая была прызначана для выстаўкі, была перакінута Белдзяржбудам на іншыя аб'екты будаўніцтва. Ня скончана нават пабудова павільёну самога Белдзяржбуду. 50 проц. павільёнаў не накрыта яшчэ толем. Накрытыя-ж дахі працякаюць, бо якасьць асмолкі—вельмі дрэнная. Пры першым-жа дажджы асмолка пацякла з даху і цяпер прыходзіцца выдаваць шмат сродкаў і сіл, каб змыць з будынкаў вялікія плямы, пакінутыя гэтай асмолкай пасьля дажджу.

Для будаўніцтва выстаўкі патрабуюцца галоўным чынам лясныя матар'ялы. Заводу «Дрэваапрацоўшчык» было дана баявое заданьне — на працягу 10 дзён працаваць выключна для выстаўкі і даць ёй 10 вагонаў дошак. Але завод заданьня ня выканаў. Запасу матар'ялаў на выстаўцы няма. Белдзяржбуд ня даў заводу свачасовых заявак.

***

На будаўніцтве выстаўкі занята каля 600 рабочых. Значная частка іх — сэзоньнікі, якія прышлі з вёсак і калгасаў. Але масавай работы сярод сэзоньнікаў не вядзецца. Абслугоўваньне іх пастаўлена агідна. На выстаўцы няма сталоўкі. Будынак, які быў прызначаны пад харчэўню для рабочых, перададзены адміністрацыйнай пад інтэрнат.

У мінулым годзе на будаўніцтве былі выпадкі антысэмітскіх вылазак. Рабфакам распусьцілі. Але інтэрнацыянальная работа ўсё-ж не вядзецца. Новы рабфак яшчэ не павярнуўся тварам да вытворчасьці. Рабфакам не стварыў рабфак сябе кадру рабочых - добраахвотнікаў.

Ёсьць шмат дырэктыў партыі і вышэйшых прафэсыянальных органаў аб абслугоўваньні сэзоньнікаў. Гэтыя дырэктывы ня выконваюцца. Трэба кінуць на гэту работу лепшыя сілы.

Арганізацыя выстаўкі будзе каштаваць каля паўтара мільёна руб. Адкрыецца выстаўка 11-га жніўня 1930 году, праз месяц пасьля таго, як Савецкая Беларусь будзе сьвяткаваць 10-цігодзьдзе вызваленьня ад белапалякаў.

Выстаўка павінна быць адкрыта ў тэрмін. Гэтага патрабуюць дзесяткі тысяч працоўных, якія чакаюць адкрыцьця выстаўкі.

МІХ. КІН.

Павільён масавх экпанатаў.



1. Галоўная брама.—2. Вэгетадыйны корпус. — 3. Корпус саматужных вырабаў.

Бяз кіраўніцтва

БЯГОМЛЬ, Менскае акр.

Парт'ячэйкі ня кіруюць групамі беднаты. Некаторыя ячэйкі Бягомльскага раёну яшчэ дагэтуль не ўявілі ўсёй важнасьці работы сярод батрацка-бядняцкіх мас вёскі. Тым часам кулакі і заможнікі ўсімі сіламі імкнуцца перашкаджаць калгаснаму будаўніцтву.

Так, ня гледзячы на ўсё гэта, некаторыя парт'ячэйкі Бягомльшчыны праміргалі працу з беднатой. Калі ўзяць, напрыклад, Іканскую парт'ячэйку, дык там нават ня ведаюць, колькі ёсьць беднаты ў сельсавеце. Няма таксама дакладнага ўліку батрацтва.

Калі сакратар Мсьціскага парткалектыву запытаўся ў сакратара ячэйкі Ленінскага імя Вароўскага — ці створаны ў калгасе групы беднаты і ці вядзецца праца з беднатой — быў атрыманы адказ: «групы беднаты створаны і работа з беднатой вядзецца». На справе аказалася, што ніякіх груп няма і ніякай работы сярод беднаты ў гэтым калгасе не праводзіцца.

Бягомльскаму райкому патрэбна тэрмінова разварушыць тыя ячэйкі, якія спаць, і тэрмінова наладзіць масавую працу сярод беднаты і батрацтва.

Б—а.

НА БАРАЦЬБУ ЗА ПРАМФІНПЛЯН

Апартуністыя зрываюць прамфінплян

БУЙНЫЯ НЕДАХОПЫ У РАБОЦЕ ФАБРЫКІ „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" ХАВАЮЦЦА ЗА „АБ'ЕКТЫЎНЫМІ ПРЫЧЫНАМІ"

Капітальнае будаўніцтва пад пагрозай зрыву

Калі правыя апартуністыя патрабавалі партыі зьніжэньня тэмпу сацыялістычнага будаўніцтва, адміністрацыя заводу фабрыкі «Чырвоная Зорка» (Менскі, Віцебскай акругі) іх у гэтым прымала. На чале з дырэктарам Ноўскім адміністрацыя на агульных сходах рабочых і на тэхнічнай нарадзе адхіліла апартуністычную лінію, патрабуючы зьніжэньня прамфінпляну. Лінія не спаткала належнага адпору. Праўда, накопт гэтага было напісана рэзалюцый, але практычна нічога ня было зроблена.

У першым паўгодзьдзі вытворчая праграма на заводзе была выканана на 80 проц. Каб апраўдацца, кіраўніцтва фабрыкі выкапала «аб'ектыўную прычыну» — дрэнная становішча пара-сілавога гаспадаркі. Між тым, калі-б адміністрацыя больш цікавілася работай паравой гаспадаркі, гэтай прычыны было-б. Трэба было выканаць прапановы рабочых і ўстанавіць прэміяльную сыстэму за лепшую работу катлоў. Гэта зроблена ня было.

Дэмабілізацыйныя настроі праявіліся ў ўсіх іншых мэтадах кіраўніцтва. Дырэктыва партыі аб адзіначальлі ня была ажыцьцёўлена. Тое самае адносна рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў. Інжынэра-рацыяналізатара т. Ганчарова, які правільна патрабаваў ад заводакіраўніцтва ажыцьцяўленьня раду рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, адміністрацыя звольніла. Ганчарова абвінавацілі, што ён — супроць крытыкі. Чаму-ж тады хэмік т. Андрэеў, член партыі, узяўшыся за гэту справу, адзначыў, што думка Ганчарова правільная? Але і Андрэеў ня мог дагаварыцца з «трыкутнікам» і прымушан быў апэляваць да рабочых сходаў. Тады супроць Андрэева адміністрацыя высунула абвінавачаньне, што ён ня лічыцца з «трыкутнікам».

Вытворчая нарада амаль спыніла сваю работу таму, што заводакіраўніцтва ня выконвае прапаноў рабочых. Вынаходца т. Уткін дабіўся ажыцьцяўленьня сваёй прапановы толькі пасьля вялікага канфлікту з адміністрацыяй. Але і да гэтага часу ён не атрымаў прэміі, якая яму належыць.

Адміністрацыя ня лічыць для сябе абавязковым прымаць удзел у пасяджэньнях РКК і пасылае бухгальтара фабрыкі.

Адміністрацыя лічыць нават немэтазгодным абгаворваць на рабочым сходзе ліст, напісаны рабочымі менскай шпалернай фабрыкі, якія просяць рабочых «Чырвонай Зоркі» выкрыць вінаватых у 9-цігадзінным прастоі шпалернай фабрыкі. Чаму? Таму, што прастой на шпалернай фабрыцы не пашкодзіў выкананьню прамфінпляну фабрыкі «Чырвоная Зорка», а наадварот — палепшыў. А што гэта пашкодзіла шпалернай фабрыцы, дык гэта іх не датычыць.

Але і ў далейшым фабрыка не гарантавана ад рантоўных «сюрпрызаў». Вось, напрыклад, фабрыка павінна была падрыхтавацца да капітальнага будаўніцтва. Але падрыхтоўка праведзена так дрэнна, што будаўніцтва знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Гэта ўсё тлумачыцца тым, што «трыкутнік» яшчэ ня зьнішчыў свайго праваапартуністычнага ўхілу на практыцы. І адпаведныя партыйныя органы ня прымаюць належных мер для рашучай барацьбы з гэтым.

А.

Да судовай адказнасьці за невыкананьне прапаноў рабочых

Адміністрацыя цьвіковага заводу „Чырвоны Кастрычнік" тармозіць сацспаборніцтвам

У часе праверкі выкананьня прамфінпляну і сацдагавораў на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» самаправерачныя брыгады спаткаліся з вялікімі цяжкасьцямі.

Прамфінплян не даведзен ня толькі кожнага рабочага і агрэгату, але нават да кожнай брыгады. Зусім няма сацспаборніцтва і вынікаў работы ударных брыгад і г. д.

Ня палянішэньня становішча ў цэхах склікана 14-га красавіка пашыраная адміністрацыйна-тэхнічная нарада. Ад апошняй адміністрацыя і тэхнічнай узялі на сябе рад абавязкаў: да 1-га мая прамфінплян да кожнага рабочага, да 1-га мая завесьці ўлік вынікаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва, а таксама ўлік ударных брыгад і ўдарнікаў.

Але ўсе гэтыя абавязкі засталіся пустымі гукам. Па сёпешні дзень адміністрацыя і тэхнэрсанал ня выканалі ні адно свайго абяцаньня. Адміністрацыя матывуе гэта тым, што не хапае кадраў работнікаў. Але такое апраўданьне больш чым сьмешнае. Якраз на «Чырвоным Кастрычніку» на кожныя 6-7 рабочых прыпадае адзін адміністрацыйна-тэхнічны і канторскі работнік. При такім штаце можна выканаць усе пазбыя мерапрыемствы па палянішэньні кіраўніцтва і абслугоўваньня рабочага калектыву.

Гэта таксама адзначыць, што адміністрацыя часта ня лічыцца з каштоўнымі прапановамі рабочых. Некалькі ўраў таму назад вытворчая нарада прапанавіла паставіць у машына-тэксавым цэху такарны варштат, каб уникнуць прастояў з-за адсутнасьці дробных рэчаў і дэталяй, напрыклад, гаек. Адміністрацыя да гэтага моманту прапановы ня выканала. І таму вытворчая нарада зусім правільна пастанавіла прыцягнуць адміністрацыю да судовай адказнасьці, бо, з прычыны адсутнасьці такарнага варштату ў машына-тэксавым цэху, ёсьць вялікія прастоі.

Ня выканана таксама прапанова аб падрыхтоўцы рабочай сілы. На заводзе не хапае кваліфікаваных рабочых. І калі 5-га мая на другой зьмене адзін рабочы захварэў і ня вышаў на работу, прышлося спыніць 12 варштатаў, якія робяць круглы машынны тэкс.

Была пастанова вытворчай нарады—азнаёміць рабочых з пераабсталяваньнем заводу. На пераабсталяваньне заводу адпушчана паўмільёна руб. Але адміністрацыя чагосьці чакае і нават з праектамі пераабсталяваньня ня хоча рабочых пазнаёміць. Гэта выклікае розныя гутаркі ў цэхах аб тым, што быццам праекты няправільныя. Асабліва шмат гутарак было пасьля таго, як прышлося закрыць новую ўборную галянтарэйнага цэху, якая каштавала каля 800 рублёў.

Невыкананьне прапаноў рабочых і неінфармаваньне рабочых аб усіх бакох жыцьця заводу значна прыніжае зацікаўленасьць рабочых сацыялістычным спаборніцтвам і выкананьнем прамфінпляну. Заводзкія арганізацыі павінны зрабіць у гэтым напрамку карэнны пералом.

Брыгадзіры ЦСПСБ
КАЙКОЎ і ВАСІЛЁНАК.

На заводзе імя Ланцуцкага сацспаборніцтва не карыстаецца пашанай

Папярэднія даныя самаправеркі сацспаборніцтва і ўдарніцтва на заводзе імя Ланцуцкага (Гомель) кажуць аб тым, што на заводзе ня было ніякага кіраўніцтва сацспаборніцтвам з боку «трыкутніка». Трафарэтныя нерэальныя дагаворы паміж ударнымі брыгадамі не наддаюцца нават самаправеркі. Ёсьць факты, калі сандагавары падпісваліся без выстарчальнага абгаварэньня іх рабочымі брыгадамі (мэханічны цэх). У большасьці рабочых і нават ударнікаў няма на руках сандагавораў. Некаторыя ўдарнікі ня ведаюць аб іх ролі на вытворчасьці.

Кіраўніцтва інжынэрна-тэхнічнай сэкцыі ўдарнымі брыгадамі адсутнічала і шэфства над ударнікамі не знайшло свайго рэальнага праламленьня. Вытворчыя камуны стараліся самацёкам на ўраўнілаўскіх пачатках і, з прычыны адсутнасьці кіраўніцтва і выпраўленьня памылак, распадаліся. А тыя камуны, якія яшчэ існуюць, таксама не стаяць на вышыні.

Прамфінплян, ня гледзячы на рад дырэктыў, не даведзен да рабочай брыгады, што ў пэўнай ступені ўскладняе цяпер пераразключэньне гаспадарча-палітычнага дагавору на больш рэальных пачатках. Ня лепшая справа і з цэхавымі дагаворамі: большасьць з іх з вытворчай праграмай ня ўвязаны. Ёсьць факты, калі дагаворы паміж цэхамі (ліцейнай і электрастанцыяй) былі згублены і знойдзены толькі цяпер. Таму, ня гледзячы на тое, што дагавор заключаны ў студзені, ён «мае моц» толькі з 1-га красавіка.

Н. ЖЫЛІНСКІ.

На ўсебеларускай нарадзе па чыстцы савецкага апарату

ПАПЯРОВЫЯ ЛІЧБЫ І САПРАЎДНАСЬЦЬ

Не бюракратызаваць шэфства рабочых над савецкімі ўстановамі

У сакавіку м-цы гэтага году ЦК і ЦКК КП(б)Б у спэцыяльнай пастанове зусім выразна высьветлілі задачы, якія паўстаюць перад прадпрыемствамі і дзяржаўнымі ўстановамі па ажыцьцяўленьні рабочага шэфства.

«Шэфства павінна забясьпечыць кантроль над працай установаў і барацьбу з бюракратызмам ва ўстановах, дапамогу ў чыстцы апарата ад чужых элемэнтаў і забесьпячэньне апарату пралетарскімі супрацоўнікамі—рабочымі вылучэнцамі. З рабочых брыгад у апарат дзяржаўных установаў павінны вылучацца рабочыя на сталую ці часовую працу».

Але, як сьведчаць матар'ялы ўсебеларускай нарады па чыстцы савецкага апарату, задач шэфства да гэтага часу на мясцох не зразумелі, самыя простыя пункты пастановы ЦК і ЦКК КП(б)Б скажаюцца, перарабляюцца на свой лад.

Амаль усе ўстановы і арганізацыі да гэтага часу не эмаглі аўладаць шэфствам. На паперы ёсьць лічбы, якія паказваюць як быццам вялікія дасягненьні ў справе арганізацыі шэфства. У Менску, напрыклад, лічыцца, што шэфства прынялі 12 прадпрыемстваў, у Гомелі—11, у Бабруйску—10, у Віцебску—6, у Магілеве—5, а ў Воршы, Мазыры і Полацку па шэфстве нічога ня робіцца. Аднак, гэтыя колькасныя паказальнікі ніяк не адпавядаюць яснаму стану шэфства. Напрыклад, Менская гута «Пралетары», якая трымае шэфства над НКЮ, нічога ня ведае аб вылучэньні добраахвотных рабочых брыгад для практычнай працы па шэфстве. Зав. «Энэргія» прыняў шэфства над НКФ. Уся праца па шэфстве абмежавалася толькі вылучэньнем рабочай брыгады з 7-мі чалавек, аб працы якое нават ФЗМК нічога ня ведае. Брыгада-ж за ўвесь час «шэфства» ніводнага разу ня была ў НКФ.

Менскія рабочыя чыгуначнікі прынялі шэфства над Белкаапсаюзам. Усё шэфства чыгуначнікаў выявілася толькі ў наладжаньні ўрачыстага вечару. Брыгад у чыгуначнікаў няма, і працы па шэфстве ніякай не вядзецца.

У Віцебску шэфства наогул набыла канцылярскія напрамкі, у выніку чаго зьявілася тое, што АКК займалася разьмеркаваньнем шэфства.

У Бабруйску шэфства над установай прымаюць не прадпрыемствы, а паасобныя групы рабочых. З справаздачы бабруйскай КК-РСІ відаць, што «столькі і столькі рабочых, такога і такога прадпрыемства ўзялі шэфства над такою і такою ўстановаю».

У Гомелі ў працы КК-РСІ наглядалася цікавая эвалюцыя: у лістападзе мінулага году КК казала, што трэба «даручыць» такому і такому прадпрыемству ўзяць шэфства над установаю, у сакавіку г. г. было ўжо не «даручыць», а «раіць» і ў красавіку «пастанову ЦК і ЦКК КП(б)Б аб шэфстве прыняць да ведама».

Слабы ўдзел у арганізацыі рабочага шэфства прымаюць амаль усе прафсаюзныя і некаторыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі.

Трэба, каб органы КК-РСІ тэрмінова прыцягнулі да працы па арганізацыі шэфства, партыйную савецкую і прафсаюзную грамадзкасьць.

Ал. МІРОНАЎ.

План кантрактацыі яравых выкананы ўсяго на 33 проц.

Усё яшчэ моцна адстае індывідуальны сэктар

Ранейшыя нерэальныя дутыя лічбы кантрактацыі пасеваў у БССР гаварылі аб выкананьні і нават перавыкананьні плянаў і ставілі Беларусь на адно з першых месц у Савецкім Саюзе. Зараз—пасьля праверкі і перазаключэньня дагавораў — значна зьніжаныя, але больш рэальныя, лічбы па кантрактацыі (33 проц. выкананьня пляну на 1-га мая) ужо ставяць Беларусь на адно з апошніх месц. Зусім зразумела, што больш каштоўны рэальныя 33 проц. (калі яны зусім рэальныя), чым дутыя, далёкія ад сапраўднасьці, 90-100 проц. Аднак, становішча з кантрактацыяй бязумоўна нездавальняючае.

Па асобных культурах і округах (па зводцы на 1-га мая) — наступны малюнак:

па жыце (азімым) плян выканан на 27 проц.;

па яравых збожжавых культурах — на 39 проц., прычым горш за ўсё кантрактавалі округі: Магілеўская (15 процантаў), Віцебская (27 проц.). Лепш у Мазырскай (65 проц.) і Гомельскай (59 проц.) округах.

Плян кантрактацыі **ільну - валакна** выканан на 32 проц. Зноў такі горш у Магілеўскай (10 проц.) і Віцебскай (22 проц.) округах. Лепш у Гомельскай (78 проц.) і Мазырскай (70 проц.). Прыблізна такі-ж малюнак мы маем і па **ільну-семі.**

Канапель закантрактавана 32 проц. пляну. Горш за ўсё кантрактацыя ішла ў Менскай (6 проц.), Магілеўскай (11 проц.) і Віцебскай (18 проц.) округах. Толькі Гомельская округа выканала заданьне на 100 проц.

Па **канюшыне** плян выканан толькі на 22 проц. Цягнуцца ў хвасьце: Віцебшчына (7 проц.) і Магілеўшчына (14 проц.). Значна лепш — у Мазырскай акрузе (84 проц.). Такі-ж процант выканаўня (22 проц.) дае і **віка.** Больш за ўсіх адстаюць Віцебшчына і Магілеўшчына. Яшчэ ніжэй выканаўне заданьня па **лубіне** (19 проц.). На апошніх мясцох — Магілеў (4 проц.) і Ворша (7 проц.). Такое-ж становішча з сэрадэляй.

Параўнаўча лепшае выканаўне пляну дае **кантрактацыя бульбы** (61 проц.). Больш за ўсіх адстаюць Віцебшчына (21 проц.) і Магілеўшчына (26 проц.). Гомельшчына поўнасьцю выканала плян, а Меншчына нават перавыканала (142 проц.).

Асобна трэба сказаць аб кантрактацыі махоркі. Узята ўстаноўка на поўнае забесьпячэньне беларускай махорачнай прамысловасьці мясцовым беларускім сырцом. З прычыны павіны справы, сёлета для БССР устаноўлена вельмі скромнае плянавае заданьне па кантрактацыі махоркі — 1.000 гэкт. Для пасеўшчыкаў - кантрактоўшчыкаў устаноўлены вельмі выгодныя ўмовы—грашовыя авансы ў 90—120 руб. за гэктар (што ў тры разы перавышае авансы пад кантрактацыю ільну), пры поўным забесьпячэньні пасеўшчыкаў пасеньнем.

На 1-га мая **махорка** закантрактавана на плошчы 642 гэкт., што складае 64 проц. пляну. З кантрактацыяй махоркі асабліва трэба сьпяшацца з прычыны таго, што ў палове мая заканчваецца

МАЛОЧНА-ЖЫВЕЛАГАДОЎЧАЯ КААПЭРАЦЫЯ БЕЗ СПЭЦЫЯЛІСТЫХ

Зоатэхнікі і вэтдактары скарыстоўваюцца нерацыянальна

На малочна - жывёлагадоўчую каапэрацыю ўскладзена адказная задача — арганізаваць у бягучым годзе 400 буйных прамыслова - сьвінаводных калгасаў і разьмясьціць у іх ня менш 100.000 матак.

Ажыцьцяўленьне гэтага заданьня патрабуе адпаведнага забесьпячэньня малочна - жывёлагадоўчай каапэрацыі кадрамі кваліфікаваных працаўнікоў.

Зараз у сыстэме Белмалжысаюзу ёсьць толькі 5 зоатэхнікаў - сьвінаводаў. Гэта колькасьць працаўнікоў ні ў якім разе ня можа забясьпечыць выкананьня мерапрыемстваў па арганізацыі прамысловай сьвінагадоўлі ў абагуленым сэктары сельскай гаспадаркі.

Між тым, у Белдзяржгандлі ёсьць 16 аграномаў - зоатэхнікаў і 3 вэтэрынарныя дактары, якія скарыстоўваюцца выключна для тэхнічнай работы па кантрактацыі бэконных сьвіней, прычым гэта кантрактацыя сыстэмай Белдзяржгандлю ня зьвязана з агра-вытворчымі мерапрыемствамі па сьвінагадоўлі.

Такое скарыстаньне спэцыялістых-зоатэхнікаў і вэтэрынарных дактароў зусім недапушчальнае. Неабходна перадаць аграномаў і зоатэхнікаў, якія працуюць у Белдзяржгандлі, малочна-жывёлагадоўчай каапэрацыі, якой яны вельмі патрэбны.

Белдзяржгандаль зараз камандыруе некалькіх зоатэхнікаў - сьвінаводаў на курсы па трусагадоўлі, зьнімаючы іх з працы па сьвінагадоўлі. Гэтае мерапрыемства няправільнае. Асоб, якія атрымалі практычны стаж у працы па сьвінагадоўлі і маюць спэцыяльную зоатэхнічную асьвету, ні ў якім разе нямэтазгодна пасылаць у Маскву на курсы па трусагадоўлі тым больш, што гэтых спэцыялістых можна і патрэбна зараз-жа скарыстаць на вялікай рабоце па сьвінагадоўлі.

С. Г.

Двухтыднёвік аховы дзяцей

Для ўзмацненьня летняй аздараўляючай кампаніі сярод дзяцей і падросткаў Наркамаховы Здароўя і НКА прапанавалі ўсім акруговым інспэкцыям аховы здароўя правесьці з 15 мая па 1 чэрвеня 2-хтыднёвік аховы здароўя дзяцей і падросткаў. У часе правядзеньня гэтага двухтыднёвіка РВК азнаёміцца з санітарна-гігіенічным становішчам у школах, дзіцячых дамох, дашкольных установах і г. д. Апрача таго, да летняй аздараўляючай кампаніі будуць падрыхтаваны пляцоўкі, лягеры, дачы і калёніі для дзяцей. Мяркуецца таксама арганізаваць у гарадзкіх і вясковых школах гарачыя сьнеданьні і прыняць канкрэтныя меры па паляпшэньні санітарна-тэхнічнага абсталяваньня ў школах.

Узмацніць тэмп сплаву

Тэлеграма старшыні ВСНГБ тав. Грысевіча

За подпісам старшыні ВСНГБ т. Грысевіча усім акрвыканкомам, раённам і прадстаўніцтвам Лесбелу паслана наступная тэлеграма:

«Тэмп сплаву ўсё яшчэ злачынна слабы, тэрмін сплаву расьцягнуўся, пагражаюча з асушкай лесу ў выплавачных рэчках, несвоячасовай здачай экспарту і зрывам забесьпячэньня будаўніцтва.

Прапаную ўзмацніць кіраўніцтва сплавам з мэтаю сканчэньня веснавога яго займаецца пытаньнем выкананьня прамфінпляну.

Урадам у летні пэрыяд Лесбелу вызначана вялікая праграма. Прапаную прыняць рашучыя меры да забесьпячэньня загатовак і вывазкі рабочай гужавой сілай».

Адгрузка бульбы ідзе ўсё яшчэ нездавальняюча

На 8-га мая з БССР адгружана ў цэнтральныя рабочыя раёны 16.135 тон бульбы, з якіх: Белпаляводсаюзам — 6.870 тон і БКС — 9.263 тоны. Паводле тэлеграмы Наркамгандлю СССР тав. Мікаяна, адгрузка бульбы (усяго 26090 тон) павінна была быць закончана не пазьней 10-га мая. Наркамгандлем БССР тэрмін быў прадоўжан да 15-га мая. З прыведзеных лічбаў відаць, што тэмп адгрузкі ўсё яшчэ нездавальняючы.

З загатоўчых арганізацый зусім недастаткова разгарнуў работу Белпаляводсаюз, які замест вызначаных 11.800 тон, на 8-га мая адгрузіў толькі 6.870 тон.

Усе партыйныя і савецкія арганізацыі павінны зацікавіцца ходам адгрузкі ў сваіх раёнах і дапамагчы загатоўчым арганізацыям у іх рабоце.

Рабочыя цэнтры, якія чакаюць нашай бульбы, павінны быць ёю поўнасьцю і своячасова забясьпечаны.

Навіны МЦРК

З 12-га мая МЦРК пачынае адпускаць пайшчыкам на дзіцячыя кніжкі па 150 грам масла па талёне ружовага колеру № 27.

Водпуск мукі для пайшчыкаў. МЦРК пачаў адпускаць пайшчыкам, якія пажадаюць, муку замест хлеба па норме 700 грам мукі за адно кілё хлеба. На 80% мука будзе жытняя і 20% пытляваная. Мука будзе адпускацца выключна з крам МЦРК № № 6, 11, 12, 13, 14, 15, 16, 19, 21 і 93.

***

З заўтрашняга дня МЦРК будзе выдаваць талёны на рамонт абутку.

З лістоў рабселькораў

ПАРА ПЕРАЙСЬЦІ НА ШМАТТЫРАЖКУ

На фабрыцы **«Дняпроўская мануфактура»** выпускаецца адна насьценгазэта на 1.000 чалавек. Газэта выходзіць не рэгулярна, заметкі ў членаў рэдкалегіі лежаць па два тыдні і больш. Зусім дрэнна рэагуюць на заметкі адміністрацыя і заўком. На заметку аб сымуляцыі адміністрацыя дае такі адказ: «нет достаточного доказательства».

Парткалектыў зусім мала ўвагі аддае насьценгазэце. Некаторыя члены бюро парткалектыву ня чытаюць газэты.

Насьценгазэта амаль што зусім не займаецца пытаньнем выкананьня прамфінпляну.

Пара ўжо перайсьці на шматтыражку.

ЧАЎНОК.

НЯМА КАНТРОЛЮ

Вучот тавараў на **каўбаснай фабрыцы** (Менск) пастаўлен надзвычай дрэнна. Вагаўшчык **Булдых** зьяўляецца бескантрольным. Ён прымае на фабрыцы мяса, адпускае на вытворчасьць і сам бяз усякага кантролю прымае выхады з вытворчасьці. Важыць і запісвае, як яму падказвае яго ўласнае сумленьне, каб толькі не пакрыўдзіць самога сябе і сваіх прыхільнікаў. Дырэктар фабрыкі т. **Шкор**—прыяцель Булдыха. Каб забясьпечыць фабрыку ад разбазарваньня каўбасы, аддаў распараджэньне, што на ўсушку і разважку каўбасы не даецца ніводнага процанту вагаўшчыку. «Мудрае» распараджэньне, але ўмовы ў вагаўшчыка такія, што ён калі захоча, дык замест усушкі, якая магчыма, можа даць больш каўбасы, чым узята з вытворчасьці, бо ён бескантрольны.

СВОЙ.

БЕСПАРАДКІ НА АДКОРМАЧНЫМ ПУНКЦЕ

На **Выдрыцкім** адкормачным пункце, **Чырвонапольскага** раёну (Магілеўшчына) адсутнічае ўлік прадуктаў, якія ідуць на харчаваньне жывёлы. Загадчык адкормачнага пункту прымае на пункт жывёлу, якою карыстаюцца не калгасы, а прыватныя асобы. Так, малаком ад адной каровы, якая цэлую зіму стаіць на адкормачным пункце, карыстаецца прыяцель загадчыка пункту, дырэктар Выдрынскага бровару. Наогул, працаўнікі пункту не ўсьвядомілі сабе ролі і значэньня адкормачнае справы і прымаюць на пункт цельных і выцеленых кароў, якія даюць малако і ня могуць быць выкармлены на мяса.

А. Б.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

АД ЦКК КП(б)Б

На пасяджэньні ПТ ЦКК КП(б)Б 18-га мая ў 11 гадз. будуць разглядацца справы наступных т. т.:

Аляшкевіча Васіля Антосева, **Міхалюка** Паўла Янкавіча, **Крысіна** Міхася Іванавіча, **Сьвірыдовіча** Мікалая Рыгоравіча, **Фейгіна** Гілеля Зэлікавіча, **Федасеева** Івана Арцёмавіча, **Сапаўева** Пятруся Сяргеевіча, **Цапкова** Іларыёна Цімафеевіча, **Зуевіча Мікалая** Цімафеевіча, **Ларчанкава** Івана Фаміча, **Каральневіча** Міхася Міхасёва, **Гінзбурга** Герца Пейсахавіча, **Блінава** Івана Якубава, **Караташа** Янкі Сымонавіча, **Хрысанфава** Янкі Хрысанфавіча, **Буднікава** Якуба Фаміча і **Бэндэрскага** Лейбы Іцкавіча.

Усе гэтыя таварышы запраш. прыняць удзел пры разглядзе іх спраў. Таксама запраш. старшыні праверкомаў, што праверкі гэтых таварышоў, і сакратары ячэек, дзе яны лічацца на вучоце.

Ад менскай біржы працы. У сувязі з пераходам біржы працы з 10-га мая на новую сыстэму работы, **рэгістрацыя**, пасылка на работу, прыём на вучот чорнарабочых у будаўнічай сэкцыі (рог Ленінскай і Унівэрсытэцкай) праводзіцца з 8 гадз. раніцы да 12 гадз. дня.

Рэгістрацыя, пасылка на працу, прыём на вучот жанчын (раней жаночая сэкцыя) будзе праводзіцца ў памяшк. юнсэкцыі (рог Ленінскай і Унівэрсытэцкай) з 8 гадз. раніцы да 1 гадз. дня, а з 10 мая чорнарабочая і жаноч. сэкцыі па Замкавай вул. № 7 закрываюцца.

СЁНЬНЯ

БАН. Пасяджэньне катэдры марксызму-ленінізму. Працяг спрэчак па дакладзе т. **Сякерскай** «Праблема кансэрватыўнага і рэвалюцыйнага ў ідэалёгіі». Пач. у 13 гадз. Уваход вольны.

ЦСПСБ. Заля пасяджэньняў. У 19 гадз. агульны сход усіх удзельнікаў міжрэспубліканскага шашачнага мачту па нерапісцы. Запраш. шахматна-шашачны актыў.

АК Мопру. Пасяджэньне Фрунзаўскага райкому Мопру. Запраш. актыў. Пач. у 18 гадз.

Пушкінская б-ка. У 19 гадз. нарада заг. гарадзкіх і прыгарадных хат.-чыт., перасоўвач. і кніганош. Т. т. з месц павінны зьявіцца з матар'ялямі аб рабоце кніж. перасовак і біб-тэк.

У 20 гадз. (памяшк. ЦП саюзу саўгандальслужачых) нарада старшынь МК і ГК па пытаньні аб ходзе праверкі выкананьня дагавораў па сацсаборніцтве.

Навуковая асацыяцыя. У 21 гадз. у клюбе Мэдпрацаўнік — агульны сход чл. пав. асац. Парадак дня: прысудж. прэмій за 1929-30 год і дакл. праф. **Бурак.** — Склярома дыхавых трактаў.

Да ведама хатніх работніц. Хатнія работніцы, якія ад'яжджаюць на дачы, павінны ўзяцца на вучот на сваіх мясцкомах.

Да ведама рабочых і іх дзяцей. Мэдсэкцыя Белтарніт'су адкрывае курсы на падрыхтоўцы на мэдфак БДУ. Скончыўш. 7-годку прымаюцца на 5-мес. курсы, а сконч. 5 груп 7-годкі на 9 мес. курсы. Заявы з камандыроўкамі ад ФЗМК і з пасьведч. аб асьвеце прым. штодзённа з 3-х да 6-ці гадз. у канц. мэдфаку (Унівэрсытэцкі гарадок, анатам. корпус. 1-шы пав.). Апошні тэрмін падачы заяў — 15 мая.

ЗАЎТРА

Папыраннае пасяджэньне прэзыдыуму Мен. АК Мопру—у 19 гадз. Парадак дня: 1) вынікі ўдзелу Мопру ў першамайскія сьвяты—інфарм. Барыс., Пухав., Засл. і Капыльск. РК і Мен. АК Мопру, 2) Аб становішчы гарадзкіх РК Мопру, 1 3) аб рабоце Мопру на летні час. Яўка членаў прэзыдыуму АК Мопру, Фрунз. і Кастр. РК—абавязкова. Запраш. актывістыя гар'ячэек Мопру.

Пасядж. Кастр. РК Мопру—у 19 гадз. Абавязк. прысутнасьць усіх дэлегатак і выдуч. школьн. яч. Запраш. жакт. актыў.

Акр. Інспэктарыят Асьветы (пак. 12). **Нарада па культ. мас. абслугоўваньні Усебеларускай выстаўкі с. г. і прамысл.** Павінны зьявіцца прадст. газбюро, ВДВ, Выд-цтва РСФСР, Белкаапсаюзу, Калгассаюзу, Белдзяржкіно, Галоўмастацтва, Дасьлед. ін-ту, БДУ, Радыёцэнтру, Дзяржмузэю, Галоўвыстаўкому ЦСПСБ, НКА, Дзярж. і Пушк. б-тэк. Пач. у 12 гадз.

Агульны сход—працяг вечару крытыкі і самакрытыкі па пытаньні аб працы апарату ВСНГ БССР і чыстцы асабовага складу. Пач. у 19 гадз. у памяшк. ВСНГ. Запраш. рабочыя фабр. і з-даў, грамадз. арг., гаспадарч. прадпр. і аб'яднаньні ВСНГ.

Дом Камсамолу (2-гі паверх). 14-V у 18 гадз. Мен. АК ЛКСМ, Кастр. і Фрунз. РК ЛКСМ склікаюць нараду апоргаў і масавых працаўнікоў калектываў і цэх'ячэек па пытаньні арганізацыі і правядзеньня палітбою. Запраш. апоргі КСМ вайсковых часьцей. Яўка абавязкова.

ДОМ ПРАЦАСЬВЕТЫ

Сёньня праўленьні клюбаў навуковых прап. і працаўнікоў асьветы

наладжваюць вечар

памяці Уладзімера Маякоўскага

Пачатак а 8 гадз. увечары. Білеты ў клюбе нав. прап. і працасьветы.

Адказны рэдактар Ян. АСЬМОЎ.

КЛЮБ ДРУКАРОЎ У НЯДЗЕЛЮ, 11 МАЯ г. г.

Рэдакцыі газэт „ПРАВДА" і „ЗЬВЯЗДА" склікаюць АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД РАБКОРАЎ цэнтральных і насьценных газэт.

У ПАРАДКУ ДНЯ: Падрыхтоўка да XIII зьезду КП(б)Б і XVI зьезду УсеКП(б) і задачы рабкораў.

Дакладчык — т. СЯКЕВІЧ.

Пасьля сходу—КІНО. Пачатак а 7 гадз. увеч.

Рэдакцыі газэт «Правда» і «Зьвязда».

Да ведама падпісчыкаў „Зьвязды"

З сёньняшнім нумарам газэты „Зьвязда" рассылаецца дармовы дадатак— ГАЗЭТА „ПРАФРУХ" № 10

Падпісчыкі! Пры атрыманьні «Зьвязды» патрабуйце дадатак „ПРАФРУ

РАЙКОМЫ, ПАРТ'ЯЧЭЙКІ і УПОЎНАВАЖАНЫЯ

У другой палове мая адкрываецца **13 ЗЬЕЗД КП(б)Б.**

Работа зьезду будзе асьвятляцца поўнасьцю на старонках „ЗЬВЯЗДЫ".

Каб даць магчымасьць атрымаць у маі месяцы газ. „ЗЬВЯЗД тым падпісчыкам, якія не пасьп падпісацца з 1 мая,

АДКРЫТА ПАДПІСКА на „ЗЬВЯЗДУ з 16 МАЯ (поўмесячная) і далейшыя тэрмі

ГАБІНЭТ ЖУРНАЛІСТЫКІ

Камдакістычнага Унівэрсытэту Беларусі Імя Ў. І. Л

пры актыўным удзеле і дапамозе: Беларускага Газэтнага Бюро, Сэкцыі працаўнікоў Друку, Камітэту па справах друку, Цэнтраархіву, Бюро Міжнар. Сувязі пры Беларускім Камітэце Саюзу Эсэрантыстых Савецкіх Рэ Дзяржбібліятэкі Музэю Рэвалюцыі і Пушкінскай Бібліятэкі

НАЛАДЖВАЕ

ВЫСТАЎКУ ДРУК

Выстаўка заключае ў сябе звыш 2000 экспанатаў і разьбіваецца на лы, галоўнымі з якіх зьяўляюцца:

1) Рэвалюцыйны друк да 1917 году.
2) Бальшавіцкі друк 1917-1922 г. г.
3) Друк С. С. С. Р. на 1930 г.
4) Замежны рэвалюцыйны ле нелегальны друк.
5) Аддзел МОНР'у.
6) Аддзел Міжнароднае Рабочае

Выстаўка зьмяшчаецца у памяшканьні Камвузу (другі паверх, пак. 2 будзе працаваць штодзенна да 25-га мая.

Наведваньне выстаўкі ад 4 да 10 гадз. увечары як экскурсіямі, гр і індывідуальна.

Для экскурсій будуць вызначаны кансультанты.

У дзень адчыненьня выстаўкі 11-га мая а 7-й гадзіне увечары у акта Камвузу адбудзецца

ВЕЧАР зьмычкі студэнтаў Камвузу з працаўнікамі рэд газэт і рабкорамі і ваенкорамі.

ПАРАДАК ДНЯ: 1. Адчыненьне выстаўкі. 2. Аб «дні друку»,—дакл дзіконага. 3. Мастацкая частка.

Уваход на разасланых білетах.

Габінэт журналістыкі КУ

11 МАЯ

Увага!!! Сёньня, 11 мая а 6 гадзіне ўвечары адбудзецца АДЧЫНЕНЬНЕ

УСЕ НА КНІЖНЫ РЫНАК

КНІЖНАГА РЫНКУ

Іграе аркестр МУЗЫКІ, ЦІКАВЫЯ АТРАКЦЫЁНЫ.

ВЫСТУПЛЕНЬНЕ ПІСЬМЕНЬН

СКІДКА ад 10% да 25%

Кніжны рынак арганізуецца БЕЛДЗЯРЖВЫДАВЕЦТВАМ, ГІЗ'АМ РСФСР і іншымі кнігагандлюючымі арганізацыямі ў ГАРАДЗКІМ СКВЭРЫ (каля Белдзяржтэатру).

Кніжны рынак працягнецца да 25-га мая.

УВАГА! У выпадку дрэннага надвор'я адчыненьне выстаўкі пераносіцца на наступны дзень

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР
Сэзон 1929-1930 году (чацьверты) у Менску

Панядзелак, 12 мая закрыты спэктакль
ГРАМАДЗКІ ПРАГЛЯД В. Катаеў
„АВАНГАРД"
п'еса у 4-х дзеях 16 малюнках,
Пастаноўка Сяргея РОЗАНАВА і К. САНЬНІКАВА
Мастак Ю. ГОЛЬЦ. Музыка Ул. САКАЛОВА.
Пачатак а 9 г. 30 м.
Прызначаны на 12 мая адкрыты спэктакль пераносіцца на 14 мая

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА
Выключнае вынаходніцтва дэманстраваньне музычнага інструмэнту „БАТЫШЧ-ТОН", які замяняе арк. стр.
Вынаходцы А. Г. і О. В. ТУЛЬСКІЯ БАТЫШЧАВЫ
пры ўдзеле артыстых „МЮЗІК-ХОЛ".
На экране ЛЮЛЬКА КАМУНАРА ў 6 част
Пачатак: 7 г., 8 г. 30 м., 10 г. 15 м.
Каса—ад 5 г. дня.

КІНО Інтэрнацыянал
Замежны мастацкі фільм
Чалавек, які сьмяецца
па раману Віктара Гюго. У галоўнай ролі Конрад Вэйдт.
Пачатак 1-га сэансу а 7 гадз. увечары.
Каса ад 5 гадз.

КІНО Пралетарый
ЗАМЕЖНЫ ФІЛЬМ
НУРЫ
кіно-п'еса ў 6 частках.
Пачатак 1 сэансу а 7 г.
Каса адкрыта ад 5 гадз.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр"
2 фільмы ў адзін сэанс 2
1) культурфільм АЛТАЙ КІЖЫ ў 5-ці частках
2) замежная камэдыя ЦІХАЯ СЯМЕЙКА ў 2 частк,
Пачатак 1-га сэансу а 2 г.
Каса адкрыта ад 12 гадз.

КІНО СпартаК
Мастацкі спартыўны фільм з цыклю «ЧЭМПІЁН СЬВЕТУ»
11 ЧАРЦЕЙ
У галоўных ролях вядомыя кіно-артыстыя ЛЮСІ АРНО і ГУСТАЎ ФРЭЛІХ. Пачатак а 7 г., 9 г. і 10 г. 45 м. Каса—ад 5 г. 30м.

Клюб САУГАНДАЛЬСЛУЖАЧЫХ.
Серада, 14 мая
закрыты КАНЦЭРТ (для саюзу саўгандальслужачых)
Маскоўскага ансамблю „ИСКУССТВО ТАНЦА"
імя Веры Майя.
Білеты ў канц. клюбу штодзенна з 6 да 9 гадз., а таксама па заяўках калектываў.

Сад „ПРАФІНТЭРН" 15-га (адчыненьне) 17 і 18 мая | БЕЛДЗЯРЖТЭАТР 16 і 19 мая
ПЯЦЬ ГАСТРОЛЯЎ МАСКОЎСКАГА БАЛЕТУ
„ИСКУССТВО ТАНЦА"
імя Веры Майя.
Білеты ў касе тэатру і ў рабкасе. | Пачатак а 9 г. увеч.

ДАВАЯВАНАЯ ЗАМЛЯ
ВЫТВОРЧАСЬЦЬ БЕЛДЗЯРЖКІНО
КІНО „КУЛЬТУРА" з панядзелка 12 МАЯ

Белдзяржкіно, сумесна з Аршанскім Акрвыканкомам
АБВЯШЧАЕ
АДКРЫТЫ ЎСЕСАЮЗНЫ КОНКУРС
на складаньне праекту будынку тэатру і кіно ў гор. Воршы, БССР.
За адносна лепшыя праекты будуць выданы пяць наступных прэмій:
1-я—3.000 р., 2-я—2.500 р., 3-я—2.000 р., 4-я—1.500 р., 5-я—1.000 р.
Падрабязныя праграмы і ўмовы конкурсу можна атрымаць: а) гор. Менск, Рэвалюцыйная, 4, *Белдзяржкіно;* б) гор. Ворша, Акрвыканком, Кіраўніцтва Акруговага інжынэра; в) гор. Масква, Ермалаеўскі зав. 17, МАО; г) Масква, ГУМ, памяшк. 278 *«Аснова»*; д) Ленінград, Мойка, 83, *Таварыства Архітэктараў.*
Тэрмін прадстаўленьня праектаў 15 ліпеня 1930 г.

ЗАОЧНЫЕ ГОСКУРСЫ РОСПИСИ (РАЗРИСОВКИ). Роспись по всевозможным тканям: мягким золот., серебр., маслян., рельефн анилин. не расплыв. красками. Бисерн., жемчужн. и мерцающ. пересыпками. Роспись по сосудам, стеклу, целлулоиду, кожи и дереву. Полный курс, 12 уроков в 4 мес. К урокам дается свыше 100 рис. (кроме текстовых). По оконч. выд. свидет. Уменье рис. не требуется. Проспект и программа высыл. за 20 коп. мел. мар.
ЗАОЧНЫЕ КУРСЫ СОНО.
МОСКВА, ул. Дзержинского, д. 1.

Для здачы АБВЕСТКІ ў газэту „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. 7-81

20 МАЯ АДКРЫВАЕЦЦА
ФОТА-ВЫСТАЎКА
прац фота-аматараў-членаў прафсаюзаў і гуртко.
Экспанаты павінны быць дастаўлены да 15 мая ў фота-лябараторыю ЦСПСБ (Дом Працы, п. № 8-а) ад 6 да 9 гадз. увечары. Жадаючым дасылаць экспанаты па пошце накіроўваць па адрасе: Менск, Дом Працы, культсэктару ЦСПСБ.

БЕЛАРУСКАЙ КАНТОРЫ ўсесаюзнага трэсту „Сьвінавод"
ПАТРЭБНЫ: зоатэхнікі, вэтэрынарныя ўрачы, інжынэр-будаўнік і падсобны будаўнік для працы як у цэнтры, так і пэрыфэрыі.
УМОВЫ ПРАЦЫ ПА ЗГОДЗЕ.
Зварачацца па адрасе: Савецкая, 70, на дворэ, 3-ці паверх, пакой 6.

КОЙДАНАЎСКАЙ МАШЫНА-ТРАКТАРНАЙ СТАНЦЫІ
ПАТРАБУЮЦЦА БУХГАЛЬТАР І РАХУНКАВОД
1-ы з акладам да 175 р., 2-гі з акладам да 100 р.
Заявы накіроўваць: Койданава, машына-трактарная станцыя.

50 К. кошт публікацыі аб згубе дакумента

СЕКАРОВСКАЯ ЖИДКО
МОСКВА 55, 2-я ВЫШЕСЛАВЦЕВ П

ПАТРЭБНЫ КАРЭКТАРЫ, якія добра ведаюць бел. мову.
Зварочвацца у к-ру газ. „Зьвязда"

АД'ЯЖДЖ Ў ВОДП
у дом АДПА на КУРО
атрымлі
газ. „ЗЬВЯ
па месцы знах
ў водпус
паведаміўшы
падпісні газ. «З
ВІШ НОВЫ
Газэта будзе д
па новым а
без асобнай

АБВЕСТКА.
На падставе пастановы НКПрацы Беларусі,
КІРАЎНІЦТВА МЕНСКАГА АКРУГОВАГА АБ'ЯДНАНЬНЯ ПРАЦКАЛЕКТЫВАЎ
ЛІКВІДУЕЦЦА.
З 10 мая 1930 году існуе Ліквідацыйная Камісія па справах кіраўніцтва, якая зьмяшчаецца ў гор. Менску, Рэвалюцыйная, 8 (тэлефон 7-47).
Усім зацікаўленым установам, прадпрыемствам і асобам прапануецца ўсе прэтэнзіі, якія ў іх маюцца, да Менскага Акруговага Аб'яднаньня Працкалектываў, прад'явіць гэтакія ў ЛІКВІДКОМ на працягу АДНАГО МЕСЯЦА, г. зн. да 10-га чэрвеня 1930 г., пасьля якога тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.
ЛІКВІДКОМ

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ даставкі газэты „ЗЬВЯЗДА" званіце па тэл. 2-49

Друкарня газэты «Зьвязда», Менск. Менск, Галоўлітбел № 337.